ЯК НЕ АТРУЦІЦЦА КАНСЕРВАМІ?
5

ПА ЎРАЖАННІ – У ДОКШЫЦЫ І БЯГОМЛЬ
13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

11 КАСТРЫЧНІКА 2023 г.
СЕРАДА
№ 197 (30077)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

КАРАТКА

• Сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі Беларусі ў жніўні дадатнае ў памеры $70,6 млн.

• **Астанкі загінулых у гады ВАВ савецкіх воінаў перапахавалі ў Добрушскім раёне.**

• Беларускую лічбавую платформу штучнага інтэлекту прэзентуюць на форуме ў НАН.

• **Тэатральная раніца для ўсёй сям'і пройдзе 15 кастрычніка ў Вялікім тэатры Беларусі.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Павел МУРАВЕЙКА, першы намеснік дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі:

«Сёння абстаноўка вакол Рэспублікі Беларусь развіваецца пад уплывам супярэчнасцяў, якія існуюць у сістэме міжнародных адносін. Мы бачым, як узмоцнена зандзіруецца глеба для пошуку болевых кропак і трыгераў у грамадстве для арганізацыі правакацый, здольных разгайдаць сітуацыю ў краіне. За мяжой пільна вывучаюць розныя сацыяльныя групы. Імкнуцца пасеяць паніку ў працоўных калектывах, ачарніць органы ўлады, сілавікоў. Безумоўна, у сучасным свеце міфаў і постпраўды адрозніць праўду ад хлусні бывае зусім нялёгка. Менавіта таму вельмі важна не паддавацца волі эмоцый, а захаваць цвярозы і аб'ектыўны падыход, умець прынцыпова ацэньваць падзеі, якія адбываюцца вакол».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«АДЗІНСТВА ДЗВЮХ ДЗЯРЖАЎ — ГЭТА ПЕРШ ЗА ЎСЁ ЭКАНОМІКА»

Прэзідэнт Беларусі расказаў, як правільна супрацьстаяць выклікам і пагрозам

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з губернатарам Новасібірскай вобласці Андрэем Траўнікавым. Гэтымі днямі ў Беларусі з рабочым візітам знаходзіцца дэлегацыя гэтага расійскага рэгіёна. Беларусь і Новасібірская вобласць маюць трывалы фундамент гандлёва-эканамічных адносін. Акрамя таго, як заўважыў кіраўнік дзяржавы, Сібір для беларусаў — асаблівы рэгіён, дзе яшчэ з кацярынінскіх часоў і рэформ Сталыпіна жыве шмат нашых землякоў, якія сваім розумам і сэрцам прыкіпелі да гэтай зямлі, праславілі яе, зрабіўшы багацейшай і прыгажэйшай.

Фота Бел ТА.

АСНОВЫ ДЛЯ РОСТУ ЁСЦЬ

Аляксандр Лукашэнка перакананы, што гэты візіт дэлегацыі Новасібірскай вобласці адкрые новую старонку ў супрацоўніцтве беларускіх і расійскіх рэгіёнаў. Беларускі лідар звярнуў увагу, што асновы для далейшага росту закладзены сур'ёзныя. Аб'ём гандлёвых аперацый летась склаў без малога 480 мільёнаў долараў. «Лічба значная, але трэба разабрацца, чаму сёння мы прыкметна адстаём ад леташніх паказчыкаў, — заўважыў ён. — Як мне дакладваюць нашы спецыялісты, адказваючы на гэта пытанне, падзенне абумоўлена найперш скарачэннем вашых паставак па такіх пазіцыях, як насенне рапсу, электрарухавікі, каменны вугаль. Прапаноўваю сумесна папрацаваць над тым, каб збалансаваць наш гандаль. Напрамкаў і магчымасцяў для ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва дастаткова».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што супрацоўніцтва з Новасібірскам грунтуецца галоўным чынам на пастаўках сельскагаспадарчай і кар'ернай тэхнікі. «Але мы ж ведаем, што поле дзейнасці на гэтым напрамку значна шырэйшае. Так, у нас ёсць магчымасць дапамагчы вам вырашыць праблемы з абнаўленнем парка пасажырскага транспарту і іншай тэхнікі», — дадаў ён. Добрым прыкладам вытворчай кааперацыі Прэзідэнт назваў мадэрнізацыю трамваяў на магутнасцях, створаных у Сібіры «Белкамунмашам». «А паколькі Новасібірск, па сутнасці, з'яўляецца адміністрацыйным цэнтрам Сібіры, праект, на мой погляд, для ўзаемнай выгады можна і трэба маштабаваць у трэцім па велічыні горадзе Расіі з улікам запатрабаванняў іншых рэгіёнаў», — сказаў ён.

СТАР. 2

ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ БЕЗ НАСТУПСТВАЎ

Што трэба ведаць тым, хто паліць смецце на сваім прысядзібным участку

Восень — час парадку на зямлі. Жыхары спяшаюцца сабраць апошні ўраджай, пасля чаго добраўпарадкоўваюць тэрыторыю, дзе яшчэ нядаўна нешта расло. Гаспадары прыватных хат, лецішчаў наводзяць парадак на сваім участку: чысцяць кветнікі, падграбаюць апалае лісце, вымятаюць дарожкі ды сцежкі, пазбаўляюцца ад усяго непатрэбнага. Работы падкінула і непагадзь, наступствы якой адчулі жыхары практычна ўсіх рэгіёнаў краіны. Пападалі дрэвы, паламала галіны, дываном з лісця засцяліла зямлю — наводзіць парадак будуць яшчэ не адзін дзень.

Галоўнае — рабіць гэта з розумам, выконваючы элементарныя правілы бяспекі. Выпадкі, калі навядзенне парадку на сваім участку заканчваецца пажарам, на жаль, не адзінкавыя. І добра, калі віноўнікі ўзгарання паспяваюць яго патушыць. Бывае ж, што агонь перакідваецца на будынкі — у выніку людзі пазбаўляюцца не толькі сельгаспабудовы, але і страчваюць дах над галавой.

СТАР. 3

Іх выбар

«ІМЯ ТАБЕ — НАСТАЎНІК»...

Сукупны стаж педагагічнай дынастыі Трафімовіч — Старжынскія — Калядка налічвае 1115 гадоў. Яна аб'ядноўвае пяць пакаленняў педагогаў, 39 прадстаўнікоў і з'яўляецца адной з самых вопытных і мудрых не толькі на Міншчыне, але і ў Беларусі. Напярэдадні прафесійнага свята педагогаў у свет выйшла кніга «Імя табе — Настаўнік», якая стала вынікам двухгадовай работы не адной сотні людзей.
Ідэя расказаць шырокай грамадскасці пра залаты фонд айчыннай адукацыі нарадзілася падчас святкавання 100-гадовага юбілею Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі.

— Нам хацелася пакінуць след для наступных пакаленняў, і мы пачалі разважаць, што можна для гэтага зрабіць, — расказвае **старшыня галіновага прафсаюза Таццяна ЯКУБОВІЧ**. — Вырашылі, а чаму б не расказаць краіне аб магутнай сіле педагагічных дынастый?

СТАР. 4

«АДЗІНСТВА ДЗВЮХ ДЗЯРЖАЎ — ГЭТА ПЕРШ ЗА ЎСЁ ЭКАНОМІКА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кіраўнік дзяржавы даручыў уладу звярнуць увагу на тое, каб у сумесным органе, які займаецца развіццём гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва Беларусі з Новасібірскай вобласцю, наша краіна была прадстаўлена службовай асобай высокага ўзроўню. Гэта звязана з тым, што Беларусь узяла курс на структураванне сваіх магчымасцяў у Расіі. «Сёння попыт на Беларусь вялікі. Але мы самі не вельмі вялікія. Таму нам трэба дакладна разабрацца, дзе будуць цэнтры, праз якія мы будзем працаваць з Расійскай Федэрацыяй. Пра Новасібірск тут і казаць няма чаго. Без Новасібірска няма паловы Расіі, прынамсі за Уралам. Таму тут павінны быць сканцэнтраваны нашы інтарэсы не толькі ў новасібірскім напрамку, але і ва ўсім сібірскім рэгіёне», — растлумачыў ён. Прэзідэнт адзначыў, што рашэнне ва ўрадзе будзе прынята ў найбліжэйшы час і беларускі бок будзе самым сур'ёзным чынам развіваць на базе Новасібірска цэнтр кампетэнцый і цэнтр гандлю на прасторы Расійскай Федэрацыі.

«Да нас даходзяць станоўчыя водгукі аб рабоце ў рэгіёне прадпрыемства «Магілёўліфтмаш». Сваёй прадукцыяй яно ў найкарацейшыя тэрміны змагло замясціць замежных вытворцаў», — заўважыў Прэзідэнт. Ён адзначыў, што гэта прадпрыемства, якое выкарыстоўвае найлепшы савецкі досвед, ды і на постсавецкай прасторы засталося адзінае, і попыт на яго прадукцыю каласальны. «Мы не проста зацікаўлены, мы павінны задаволіць вашу патрэбу ў пастаўках гэтай прадукцыі», — дадаў беларускі лідар.

Традыцыйна значная частка беларускага экспарту — харчовыя тавары і сельскагаспадарчая сыравіна. У поўнай меры гэта адносіцца і да Новасібірскай вобласці. «Улэўнены, што, узаемадзейнічаючы ў сферы аграпрамысловага комплексу — ад будаўніцтва ў вёсцы да біятэхналогій, мы можам зрабіць значна больш, чым робім цяпер», — перакананы Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, гэтаксама, як у навуцы і адукацыі. «Бо невыпадкова Новасібірск, у якім даўно і паспяхова працуюць аддзяленне Расійскай акадэміі навук і сумарна амаль сотня інстытутаў, даследчых цэнтраў і ВНУ, неафіцыйна называюць навуковай і студэнцкай сталіцай Сібіры. Сувязі паміж нашымі вучонымі ніколі не перарываліся. Ёсць узаемадзеянне, планы і праекты, але гэта ўсё, на мой погляд, трэба паскарацьі напаўняць канкрэтыкай. Тут мы гэту заўвагу можам да сябе аднесці, мы тут не вельмі актыўна працуем. Напрыклад, можам аб'яднаць нашы намаганні ў перспектыўных, вельмі важных новых кірунках — штучнага інтэлекту і беспілотных авіяцыйных сістэм з улікам задач па імпартазамяшчэнні і забеспячэнні тэхналагічнага суверэнітэту з прыцэлам на апераджальнае развіццё», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў Беларусі і Новасібірскай вобласці ёсць усе магчымасці заўважна прымножыць паказчыкі гандлю і ўмацаваць сувязі ў навукова-адукацыйнай, гуманітарнай і іншых сферах. «Я гарантую вам, што ўсе нашы дамоўленасці будуць безумоўна выкананы. Прычым якасна і ў тэрмін», — запэўніў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь інтэнсіўна развівае адносіны з дзяржавамі дальняй дугі. «Калі ў вас будуць інтарэсы і мы вам чымсьці зможам дапамагчы (вы самі бачыце, дзе і чым), мы гатовы вам дапамагчы і разам працаваць у гэтых дальніх дзяржавах. Там попыт на нас вялізны», — сказаў ён, дадаўшы, што падчас апошняй сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі дэталёва абмяркоўвалі гэта пытанне. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што Расія ў цэлым і сама паспяхова працуе ў гэтых краінах, але што датычыцца яе рэгіёнаў, то Беларусь магла б разам з імі стварацьі сумесную прадукцыю і прадстаўляць яе на гэтых перспектыўных рынках.

СПАКОЙНА НЕ БУДЗЕ

«Для нас сёння час магчымасцяў. Вы, Андрэй Аляксандравіч, гэта не горш за мяне ведаеце», — заявіў Прэзідэнт. У адносінах да заходніх кампаній, якія пакінулі беларускі і расійскі рынак, ён выказаўся коратка: «Сышлі — і да сустрэчы». Кіраўнік дзяржавы перакананы, што ў Беларусі і Расіі павінна быць «усё сваё». Па яго словах, сёння ідзе магутная кааперацыя з расійскім бокам, і вельмі важна не дапусціць дубліравання вытворчасці. «Тое, што ёсць у нас, будзе працаваць заўсёды на расійскім рынку. Тое, што ёсць у вас, мы заўсёды (калі такая патрэба будзе) купім. Таму нельга дапусціць дубліравання. Адзінства — гэта перш за ўсё эканоміка. Адзінства дзвюх дзяржаў — гэта перш за ўсё эканоміка. Менавіта так мы бачым гэта з Беларусі. І, калі ў Расіі будзе такі ж рух, як цяпер у эканоміцы, калі будуць такія ж добрыя адносіны ў нас з Расіяй, як з асобнымі рэгіёнамі, у тым ліку з вашым, паверце, не трэба ніякай агітацыі», — сказаў ён.

Прэзідэнт звярнуў увагу на моцныя чалавечыя сувязі паміж жыхарамі Беларусі і Новасібірскай вобласці ў прыватнасці і Расіі ў цэлым. Людзі сябруюць, наведваюць месцы агульнай воінскай славы. «У нас усё ёсць для таго, каб выбудоўваць адносіны. Мы многае зразумелі, зразумелі нашы памылкі, недахопы», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што яшчэ ў пачатку санкцыйнага ціску казаў, што Беларусь і Расія з гэтай сітуацыі выйдуць, толькі патрэбна крыху часу. «Паўтара — два гады прайшло, і мы бачым, што атрымліваецца. Толькі трэба ісці гэтым шляхам, выкараняючы тыя недахопы і недапрацоўкі, якія мы дапусцілі за час пасля таго, як мы разышліся ў розныя бакі. Дзякуй богу, што адзінства сваё захавалі. Але павінен сказаць, што спакойна нам не будзе», — адзначыў ён.

Прэзідэнт расказаў, што перад сустрэчай з гасцямі прачытаў змястоўныя даклады спецслужбаў: «Цытаты службовых асоб адтуль: «Спакойна не будзе». Яны жывуць і бачаць (яшчэ не вылезлі з Украіны), што трэба рассекчы адзінства Беларусі і Расіі». Па словах Аляксандра Лукашэнкі, у гэтым зацікаўлены ўсе краіны на Захадзе, нават тыя, якім, здавалася б, павінна быць усё роўна, што адбываецца ў Беларусі і Расіі і паміж нашымі краінамі. Але гэта адзінства — «дрэнны прыклад» для іншых, таму яго любымі спосабамі — «недзе пугай, недзе пернікам, недзе падсаладзіць, адкалоць чыноўнікаў, раскалоць, ад Прэзідэнта адарваць» — будуць спрабаваць парушыць. «Вось гэтыя заявы вераснем-кастрычнікам датаваныя. Таму спакойна не будзе», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка. Ён перакананы, што Беларусі і Расіі трэба нацэліцца на вытворчасць уласнай прадукцыі. Бо, па яго словах, нават сяброўскія краіны прытрымліваюцца сваіх інтарэсаў, перш за ўсё. «Таму давайце ўмацоўваць сваю Айчыну, абараняць яе. Я вас агітую на гэта, хоць вы разумныя людзі і не горш за мяне разумееце, што ў нас толькі гэты шлях, іншага няма. І мы можам выглядаць прыстойна. За пяць гадоў мы забудзем тое, што адбываецца цяпер», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

СУСТРЭЧЫ НА ВЫСОКІМ УЗРОЎНІ ДАЮЦЬ ДАДАТКОВЫ ІМПУЛЬС

Андрэй Траўнікаў заўважыў, што сёння ў Новасібірскай вобласці пражывае шмат беларусаў і на розных этапах гісторыі беларусы зрабілі шмат для гэтага рэгіёна. Новасібірцы таксама ўнеслі свой уклад у станаўленне машынабудавання, энергетыкі Беларусі. «Узаемныя візіты нашых калег пастаянныя, нягледзячы на адлегласці. Не адзін раз у год дзелавыя дэлегацыі прыязджаюць у Новасібірск, Мінск, вядуць перагаворы. Безумоўна, сустрэчы на высокім узроўні важныя, яны даюць дадатковы імпульс», — адзначыў губернатар Новасібірскай вобласці. Па яго словах, візіт кіраўніка беларускага ўрада Рамана Галоўчанкі ў Новасібірск у красавіку адкрыў новыя напрамкі для супрацоўніцтва. І цяперашняя дэлегацыя складзена ў асноўным з кіраўнікоў прадпрыемстваў, у працяг тэм, якія акрэсліў прыярытэтнымі беларускі прэм'ер-міністр.

Валерыя СЦЯЦКО.

❍ У тэму

БЕЛАРУСКІЯ ПАРТНЁРЫ — НАЗАЎЖДЫ

У размове з журналістамі Андрэй Траўнікаў пералічыў прыярытэтныя падыходы супрацоўніцтва Беларусі і Новасібірскай вобласці. «Сёння, калі перад намі стаяць тэрміновыя задачы забеспячэння тэхналагічнага суверэнітэту, неабходна каардыніраваць умовы, каб, з аднаго боку, выключыць дубліраванне, а з іншага — не выпусціць важныя нішы. Мы стараемся ў супрацоўніцтве з Рэспублікай Беларусь прытрымлівацца гэтых прынцыпаў. Напрыклад, гістарычна ў нас не было моцнага станкабудавання, шырокай наменклатуры станкоў у Новасібірску не выраблялася. У Беларусі гэта вытворчасць ёсць, і мы зацікаўлены ў гэтай прадукцыі. У нашым акадэмгарадку ёсць прадпрыемствы, якія засвоілі ўнікальныя вузлы для сучасных станкоў. І тут мы можам аб'яднаць намаганні. Нашы наватары атрымаюць заказы, а беларускія машынабудаўнікі атрымаюць сучаснае станочнае абсталяванне. Гэта новы кірунак нашага супрацоўніцтва», — расказаў Андрэй Траўнікаў. Сярод кірункаў — і супрацоўніцтва ў сельскай гаспадарцы. Новасібірская вобласць — трэцяя ў Расіі па аб'ёме малочнага статка. «Вядома, мы зацікаўлены ў далейшай мадэрнізацыі гэтай галіны. Не буду хаваць, раней арыентаваліся на вядомых еўрапейскіх вытворцаў абсталявання. Сёння гатовы разам з беларусамі засвойваць аналагі, каб у далейшым у нашых будучых праектах па мадэрнізацыі комплексаў выкарыстоўваць абсталяванне сумеснай вытворчасці», — падкрэсліў губернатар. Па яго словах, дзве тэмы на сустрэчы падказаў і сам Прэзідэнт. Гэта ўкараненне штучнага інтэлекту і беспілотных авіяцыйных сістэмы. Да гэтага ў плане сумесная работы такіх кірункаў не было, хоць яны і вельмі актуальныя. «Кампетэнцыі ёсць і з аднаго, і з другога боку. Гэтыя кірункі будуць уключаны ў наш план супрацоўніцтва», — падкрэсліў Андрэй Траўнікаў. Па яго словах, на сустрэчы з Прэзідэнтам быў абмеркаваны шырокі спектр тэм ад сельскай гаспадаркі да навукі, ад пытанняў бяспекі да гуманітарных сфер.

Важны крок у развіцці адносін Беларусі і Новасібірскай вобласці — стварэнне ў Новасібірску адзінай сэрвіснай пляцоўкі для ўсіх машынабудаўнічых беларускіх брэндаў на базе гандлёвага дома «МТЗ-Сібір». «Новасібірск і рэгіён шмат спажываюць самай разнастайнай беларускай машынабудаўнічай прадукцыі: ад камунальнай тэхнікі да складаных сельгасагрэгатаў. З боку ўрада ў вобласці будуць аказаны ўсе меры падтрымкі, падбор зямельных участкаў, прэферэнцыі, якія прадугледжаны ў нашым заканадаўстве. Мы ў гэтым праекце зацікаўлены», — сказаў Андрэй Траўнікаў.

Журналісты пацікавіліся, наколькі складана беларускім вытворцам канкурыраваць з кітайскімі кампаніямі, якія геаграфічна знаходзяцца бліжэй і таксама зацікаўлены ў рабоце на сібірскім рынку. «Заходзіць на рынак складана ў станкабудаванні, і ў аўтамабільнай тэхніцы, і ў сельгастэхніцы. Кітайскія вытворцы хутка прагрэсіруюць па якасці і тэхнічных параметрах. Па кошце з імі канкурыраваць вельмі цяжка», — адзначыў губернатар Новасібірскай вобласці. Але ў той жа час, па яго словах, важна вытрымліваць баланс, каб не апынуцца ў поўнай залежнасці ад азіяцкіх кампаній. Андрэй Траўнікаў адзначыў, што яны зацікаўлены ў шырокіх прапановах на рынку. «Зыходзячы з нашых партнёрскіх адносін з Беларуссю, мы, па сутнасці, укладаем у сумесную эканоміку, імкнёмся стварыць пераважныя ўмовы для прасоўвання беларускіх тавараў. Работа ў гэтым кірунку ідзе: не толькі дзейнічаюць сумесныя вытворчасці, але і арганізоўваецца доследная эксплуатацыя перспектыўных узораў беларускай тэхнікі на прадпрыемствах рэгіёна. Гэта дае магчымасць беларускім вытворцам улічыць усе пажаданні кліентаў і быць максімальна канкурэнтаздольнымі па якасці. Мы разумеем, што беларускія партнёры — назаўжды, а іншыя прапановы могуць быць часовыя», — рэзюмаваў ён.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Кітаі адзначылі, што «Адзін пояс, адзін шлях» не з'яўляецца геапалітычным інструментам



Пра гэта гаворыцца ў Белай кнізе, прысвечанай кітайскай ініцыятыве «Адзін пояс, адзін шлях» і апублікаванай прэс-канцылярыяй Дзяржсавета КНР, паведаміла ТАСС. «Гэта не план знешняй дапамогі Кітая і не геапалітычны інструмент, а план дзеянняў для сумеснага развіцця. Гэта не замена існуючых рэгіянальных механізмаў, а стварэнне пераваг і ўзаемных дапаўненняў для ўжо існуючых», — адзначаецца ў дакументе. Як вядома, ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях» — канцэпцыя, прапанаваная ў 2013 годзе старшынёй КНР Сі Цзіньпінам для актывізацыі міжнародных шматбаковых гандлёва-інвестыцыйных праектаў з удзелам зацікаўленых краін і выкарыстаннем кітайскага, а таксама замежнага капіталу. Да яе ўжо далучыліся звыш 150 дзяржаў і больш за 30 міжнародных арганізацый.

Кошт дзяржаблігацый ЗША абваліўся да 16-гадовага мінімуму

Федэральная рэзервовая сістэма падняла стаўкі да 5,5 працэнта (да самага высокага з 2007 года ўзроўню) з мэтай збіць цэны на паліва і інфляцыю. Аб гэтым паведаміла РІА «Новости». Таксама чарговы гістарычны максімум абнавіў дзярждоўг. Гэта адбылося на наступны ж дзень пасля пачатку новага фінансавага года ў ЗША. На думку інвестараў, на рынку каштоўных папер складваецца даволі небяспечная сітуацыя. Прапанова аблігацый ужо перавышае попыт. Акрамя таго, высокія стаўкі і запазычанасць краіны ўжо ў чацвёртым квартале могуць прывесці эканоміку ў рэцэсію.

У Славакіі адбылося наймацнейшае за больш чым 80 гадоў землетрасенне



Эпіцэнтр землетрасення магнітудай 5 знаходзіўся за 56 кіламетраў на паўночны ўсход ад горада Кошыцэ, у якім пражывае каля 236 тысяч чалавек, паведамляецца на славацкім сайце Imeteo. Ачаг залягаў на глыбіні 10 кіламетраў. Землетрасенне было настолькі моцным, што яго адчувалі ў радыусе да 200 км, а наступствы магло адчуць больш за 6 мільёнаў чалавек. Ад падземных штурхкоў у сяле Пакастоў пацярпеў грэка-каталіцкі храм, на сценах з'явіліся расколіны. Таксама пацярпелі будынкі ў вёсках вакол эпіцэнтра землятрусу. Як распавялі ў славацкім Інстытуце навук аб Зямлі, перад гэтым наймацнейшае землетрасенне магнітудай 7 адбылося 5 чэрвеня 1941 года ва Усходняй Славакіі.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні міністру аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Дзмітрыю Леанідавічу ПІНЕВІЧУ ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

Соцыум

СЯМЕЙНЫ АДПАЧЫНАК, ТУР НА ВЫХАДНЫЯ І СПА-ТУРЫЗМ

Чым сёлета прываблівалі беларускія санаторыі?

З кожным годам айчынныя санаторыі карыстаюцца ўсё большым попытам як у саміх беларусаў, так і ў нашых суседзяў. Сёлетняя статыстыка сведчыць, што па колькасці адпачывальнікаў 2023 год дасягне і нават перавысіць самы пікавы ў гэтых адносінах 2019-ы. Пры гэтым санаторыі паступова губляюць імідж месца адпачынку для людзей сталага веку. У прыватнасці, здраўніцы, размешчаныя на возеры Нарач, прывабліваюць аздараўленчымі праграмамі турыстаў, якія раней выбіралі курорты Турцыі і Егіпта. Увогуле, такі кірунак, як СПА-турызм выхаднога дня, набірае ўсё большую папулярнасць у беларусаў.

100-ПРАЦЭНТНАЯ ЗАГРУЗКА ЛЕТАМ

Ужо становіцца традыцыяй, што летні перыяд пераўтвараецца ў сапраўды гарачую пару для айчынных здраўніц. Вось і мінулым летам запоўнены яны былі цалкам, а набыць пуцёўку нават вясной на летнія месяцы ўжо было немагчыма.

— Па выніках летняй аздараўленчай кампаніі санаторна-курортны комплекс працаваў стабільна і быў запатрабаваным, — адзначае **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь БАЛБАТОЎСКІ**. — Па аператыўных даных, за 9 месяцаў мы выходзім на сярэднюю запаўняльнасць па годзе ў 84 %, што адпавядае той высокай лічбе, якая была ў самым паказальным і запатрабаваным 2019-м.

З пачатку года ў беларускіх санаторыях прайшлі аздараўленне і лячэнне 1 мільён 172 тысячы чалавек. Выручка ад рэалізацыі паслуг склала 802 мільёны рублёў, што перавышае паказчык за аналагічны перыяд мінулага года на 22 %. Станоўчая дынаміка назіралася і па экспарце паслуг: у Беларусі адпачылі 166 тысяч замежнікаў, што на 17 % больш, чым летась. У нашай краіне яны пакінулі больш за 240 мільёнаў рублёў, што больш чым на 31 % за леташні паказчык.

КАЛЯ ТРЭЦІ АДПАЧЫВАЛЬНІКАЎ — ГОСЦІ З СУСЕДНІХ КРАІН

Што датычыцца замежнікаў, то яны складаюць каля 30 % адпачывальнікаў у нашых здраўніцах. Пераважная большасць замежных гасцей — 90 % — з Расіі.

— Іх прываблівае ў першую чаргу прыродны патэнцыял беларускіх санаторыяў і вынікі аздараўлення і лячэння. Сюды прыязджаюць, каб атрымаць унікальную паслугу, якую нельга атрымаць ні ў якім іншым месцы. У беларускіх санаторыях захаваліся методыкі лячэння з выкарыстаннем пераважна прыродных лячэбных фактараў. На тэрыторыі нашых 102 санаторыяў сёння функцыянуе больш за 90 свідравін з мінеральнай вадой: па сутнасці, кожны санаторый мае свой унікальны прыродны патэнцыял. Прымяняюцца і розныя методыкі з выкарыстаннем лячэбнай гразі. Сёння яе атрымліваюць усяго толькі з пяці вадаёмаў Беларусі. А увогуле, зарэзервіравана каля 100 азёр, гразі якіх могуць выкарыстоўвацца з лячэбнай мэтай. Усё гэта дае станоўчыя вынікі лячэння, і ў нас высокі працэнт паўторных кліентаў, у некаторых санаторыях ён перавышае 70—80 %. Гэта сведчанне таго, што людзі прыязджаюць па вынік, — расказаў Генадзь Балбатоўскі.

Дарэчы, пераважную большасць пуцёвак — 80 % — санаторыі рэалізоўваюць самастойна праз аддзелы маркетынгу, і толькі 20 % — праз турыстычныя арганізацыі і выставачныя пляцоўкі.

— Устойлівы попыт існуе, пра што сведчыць і глыбіня продажаў. На кастрычнік ужо забраніравана больш за 85 % месцаў, лістапад — больш за 78 %, снежань — 56 %, на навагоднія святы — 83 %. Прагноз станоўчы, мяркую, па годзе мы выйдзем на сярэднюю запаўняльнасць у 80 %, — прывёў лічбы Генадзь Балбатоўскі.

90 РУБЛЁЎ ЗА СУТКІ

Сярэдні кошт за 9 месяцаў склаў 90 рублёў за месца ў суткі ў стандартным нумары. У снежні мінулага года гэта каштавала 86 рублёў, адпаведна рост цэн склаў 5 %. У асенне-зімовы перыяд росту цэн не плануецца, наадварот, некаторыя здраўніцы даюць зніжкі. А вось на навагоднія святы цэны ў параўнанні з мінулагоднімі вырастуць на 10 %. Калі летась суткі ў святочныя дні абыходзіліся ў сярэднім у 93 рублі, то сёлета — каля 110 рублёў.

Яшчэ адна тэндэнцыя — сярэдні ўзрост наведвальнікаў санаторыяў зніжаецца. І сёння яны ўсё меней асацыіруюцца з месцам для адпачынку пажылых людзей.

— Санаторыі «Прыазёрны» і «Спадарожнік» летась і сёлета прывабілі турыстаў, якія раней наведвалі курорты Турцыі і Егіпта, а гэта маладое пакаленне. Санаторыі прапаноўваюць розныя віды паслуг для рознай аўдыторыі. Гэта сямейны адпачынак, пуцёўкі выхаднога дня, СПА-турызм, — прыводзіць прыклады суразмоўнік.

Для гэтага патрабуецца пастаяннае абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы. За 9 месяцаў бягучага года здраўніцы на гэта выдаткавалі 85 мільёнаў рублёў. Прычым штогод гэта лічба расце прыкладна ў 1,5 раза. Летась за год укладзена 84 мільёны рублёў, у 2021 годзе — 76. Але самай істотнай лічба была ў перыяд пандэміі, калі большасць аздараўленчых устаноў не прымалі гасцей і праводзілі маштабныя рамонты, — 128 мільёнаў рублёў.

ДЗЕ АДПАЧЫЦЬ ДЗЕЦЯМ?

За межамі Беларусі маецца 5 санаторыяў, дзе летась адпачылі 6,5 тысячы беларусаў. Тры з іх знаходзяцца ў Туапсэ, Сочы і Крыме, і праблем з іх функцыянаваннем няма. Два санаторыі знаходзяцца ў Літве і Латвіі. Здраўніца ў Друскінінкаі працуе стабільна, там праходзяць аздараўленне як беларускія дзеці з бацькамі, так і грамадзяне ЕС.

— Штоквартальна туды выязджаюць дзіцячыя групы і дзеці з бацькамі пры наяўнасці віз. У перыяд асенніх канікул на аздараўленне паедуць чарговая дзіцячая група і дзеці з бацькамі. Як вядома, МЗС Літвы адмаўляе ў выдачы віз нават дзецям-інвалідам. Вядзецца свабодная рэалізацыя пуцёвак для грамадзян Еўрасаюза. Мы спадзяёмся на аднаўленне выдачы віз, — адзначыў Генадзь Балбатоўскі. — Што датычыцца беларускага санаторыя ў латвійскай Юрмале, то ён пакуль зачынены, а мінімальны штат супрацоўнікаў забяспечвае захаванасць маёмасці.

Дарэчы, падчас дзіцячай аздараўленчай кампаніі гэтым летам быў цалкам задаволены попыт. Планавалася аздаравіць 377 тысяч юных беларусаў, але ахвотных аказалася яшчэ больш. У выніку ў лагерах пабывалі 388 тысяч дзяцей. Перавыкананы план і па аздараўленні сацыяльна неабароненых катэгорый — дзяцей-сірот (на 11 %) і дзяцей-інвалідаў (на 20 %). На дзіцячае аздараўленне з бюджэту быў выдаткаваны 61 мільён рублёў, які пайшоў на датацыі і патанненне кошту пуцёвак.

А з 29 кастрычніка стартуе чарговая дзіцячая аздараўленчая кампанія, на якую з бюджэту выдаткавана больш за 2 мільёны рублёў. Мяркуецца, што падчас асенніх канікул у лагерах пабываюць 69 тысяч дзяцей.

Алена КРАВЕЦ.

ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ БЕЗ НАСТУПСТВАЎ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Па іх неабачлівасці церпяць і іншыя — не раз ратавальнікі выязджалі тушыць пажар, які ахапіў ледзь не ўсю вёску. Зусім трагічна, калі агонь пазбаўляе чалавека жыцця...

Каб не дапусціць падобнага і навесці парадак на сваім участку без наступстваў, супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях рэкамендуюць прыслухацца да іх парад.

Фота МНС.

Наступствы пажару ў Бабруйскім раёне.

ПАДРЫХТУЙЦЕ МЕСЦА І КАНТРАЛЮЙЦЕ

Самы бяспечны спосаб справіцца са смеццем — утылізаваць яго на палігоне цвёрдых бытавых адходаў. Пра такія месцы, вядома, ведае не кожны гаспадар прысядзібнага ўчастка. А калі хто і ў курсе, то наўрад ці калі-небудзь вазіў туды сваё смецце. Прасцей распаліць вогнішча ў сябе на падворку. Законам гэта не забараняецца. Галоўнае, нагадваюць ратавальнікі, разводзіць агонь з улікам правіл пажарнай бяспекі.

— Месца, дзе будзеце спальваць смецце, павінна знаходзіцца на бяспечнай адлегласці ад будынкаў і збудаванняў, — звяртае ўвагу **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ**. — Яго патрэбна расчысціць ад гаручых рэчываў і матэрыялаў, сухой расліннасці. Каб агонь не распаўсюджваўся па сухой траве, вогнішча неабходна акапаць. Катэгарычна забараняецца выкарыстоўваць для распальвання гаручыя ці лёгкаўзгаральныя вадкасці!

Менавіта ад жадання хутчэй развесці вогнішча вясной пацярпеў барысаўчанін. Ратавальнікам паступіла паведамленне аб шпіталізацыі з апёкамі 10 % цела пенсіянера. Як потым высветлілася, мужчына на тэрыторыі прыватнага домаўладання спальваў смецце, выкарыстоўваючы пры гэтым лёгкаўзгаральную вадкасць. Па неасцярожнасці ён праліў вадкасць на рукі. Адбылася ўспышка пары — на мужчыне загарэлася адзенне. У выніку здарэння пенсіянер атрымаў апёкі жывата, кісці рукі і левай нагі. Пацярпелы самастойна ліквідаваў загаранне адзення і выклікаў хуткую медыцынскую дапамогу. Падраздзяленні МНС не прыцягваліся.

Яшчэ адна вельмі важная дэталь: спальванне неабходна ажыццяўляць пад пастаянным кантролем. Пад рукой павінны быць першасныя сродкі пажаратушэння: вогнетушыцель або вядро вады і рыдлёўка — у выпадку пазаштатнай сітуацыі гэтыя звычайныя рэчы дапамогуць папярэдзіць распаўсюджванне агню. Пасля таго, як вогнішча дагарэла, заліце вуглі вадой: гэтым вы папярэдзіце паўторнае ўзгаранне. Калі на вуліцы ветранае надвор'е, лепш навядзенне парадку на прысядзібнай тэрыторыі, звязанае са спальваннем смецця, перанесці на іншы дзень.

ГАРЫЦЬ — ПАВЕДАМЛЯЙЦЕ

Як паказвае практыка, калі пачынаецца ўзгаранне, людзі нярэдка губляюцца. У асноўным не здольны аператыўна рэагаваць на надзвычайную сітуацыю людзі пажылога ўзросту. Часам гэта прыводзіць нават да таго, што пасля такога навядзення парадку на зямлі ёсць загінулыя. У лепшым выпадку ўсё заканчваецца апёкамі, ад чаго таксама мала прыемнага.

Ратавальнікі звяртаюцца да грамадзян, каб яны не праходзілі міма травы або пабудовы, якія гараць. Пры немагчымасці патушыць пажар сваімі сіламі варта паведаміць аб узгаранні ў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях па нумарах 101 або 112.

Менавіта дзякуючы пільнасці жыхаркі адной з вёсак Бабруйскага раёна ўдалося пазбегнуць сур'ёзных наступстваў узгарання. Убачыўшы, што ў суседа гарыць хлеў, жанчына аператыўна праінфармавала аб гэтым ратавальнікаў. Калі супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях прыбылі да месца выкліку, хлеў гарэў адкрытым полымем. Агонь ахапіў і сцяну суседняй гаспадарчай пабудовы, узнікла пагроза жылому дому. Гаспадар знаходзіўся ў дварах, з яго слоў усярэдзіне нікога не было. Ратавальнікі аператыўна ліквідавалі пажар і не далі агню распаўсюдзіцца на суседнія будынкі. Мужчына, які да прыбыцця ратавальнікаў спрабаваў тушыць пажар самастойна, атрымаў апёкі 1—2 ступені 3 % цела. Пацярпелага даставілі ва ўстанову аховы здароўя. У выніку пажару хлеў быў знішчаны, сцяна суседняй сельскагаспадарчай пабудовы пашкодзілася. Прычына пажару — неасцярожнае абыходжанне з агнём пры спальванні смецця.

Дарэчы, выпальванне сухой расліннасці забаронена законам. Згодна з Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях, за незаконнае выпальванне сухой расліннасці, траў на корані, а таксама ржышча і пожніўных астаткаў на палях або непрыняцце мер па ліквідацыі выпальванняў віноўныя асобы прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу ў памеры ад 10 да 30 базавых велічынь. За развядзенне вогнішчаў у забароненых месцах прадугледжана накладанне штрафу да 12 базавых велічынь. Прычыненне шкоды ў асабліва буйным памеры пагражае крымінальнай адказнасцю.

Людзі, якія змагаюцца са смеццем такім чынам, не задумваюцца яшчэ і аб тым, якую шкоду яны наносяць расліннаму свету. Спальванне сухастою прыводзіць да збяднення расліннасці, павышэння кіслотнасці і памяншэння ўрадлівасці глебы. Амаль усё жывое, што знаходзіцца ў сухой траве або на паверхні зямлі, гіне падчас узгарання. Нярэдка на папялішчах знаходзяць спаленыя птушыныя гнёзды, грызуноў, вожыкаў і нават зайчанят.

Такім чынам, падыходзьце да «генеральнай прыборкі» тэрыторыі з розумам. Думайце не толькі аб прыгажосці на ўласным падворку, але і аб бяспецы — сваёй і тых, хто пражывае побач.

Вераніка КАНЮТА.

Класныя навіны

МАТЫВАЦЫЯ ДА ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАФЕСІІ — САМАЕ ВАЖНАЕ

Праблемы развіцця творчага патэнцыялу ў будучых педагогаў, досвед дзейнасці педагагічных класаў, лічбавыя выклікі, якія стаяць перад сістэмай адукацыі, тэхналогіі ў кантэксце тэорыі пакалення, развіццё крэатыўнага мыслення, функцыянальнай адукаванасці і многія іншыя пытанні аказаліся ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Актуальныя напрамкі і перспектывы педагагічнай адукацыі», якая адбылася на пляцоўках Мінскага гарадскога інстытута развіцця адукацыі, 86-й сталічнай школы і 20-й мінскай гімназіі.

— Гэта мерапрыемства праходзіць пры падтрымцы Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама ўжо трэці раз, — паведаміла **загадчыца кафедры кіравання і эканомікі адукацыі Мінскага гарадскога інстытута развіцця адукацыі Алена БЯЛЬНІЦКАЯ**. — Правядзенне канферэнцыі ініцыявала кіраўніцтва мінскай сярэдняй школы № 86 імя Фамы Занько, у якой дзейнічаюць два педагагічныя класы. З кожным годам пляцоўка для прафесійных зносін педагогаў пашыраецца. Сёлета да дыскусіі далучыліся ўжо больш як 200 удзельнікаў з усёй краіны, а таксама з Расійскай Федэрацыі. Гэта не толькі вучоныя, педагогі-практыкі, але і навучэнцы педагагічных класаў, якія яшчэ стаяць на парозе прафесійнага выбару. Ім было прапанавана паразважаць на тэму «Мая будучая прафесія — настаўнік». Адна з секцый канферэнцыі менавіта так і называлася.

Трэба заўважыць, што яшчэ ў 2014 годзе Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт выступіў з ініцыятывай увядзення профільнай педагагічнай падрыхтоўкі ў 10—11-х класах установ агульнай сярэдняй адукацыі Беларусі. Гэтая ідэя знайшла падтрымку на дзяржаўным узроўні, ва ўстановах адукацыі, у школьнікаў і іх бацькоў. З 2015/2016 навучальнага года першыя педагагічныя класы і групы былі адкрыты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Дынаміка адкрыцця педкласаў аптымістычна: 2015/2016 навучальны год — 102 класы і каля 1500 старшакласнікаў, а ў мінулым 2022/2023 навучальным годзе — 756 педкласаў і больш за 6700 навучэнцаў. У педкласах Мінска навучаюцца 1700 старшакласнікаў.

Спецыяльна для педкласаўцаў была распрацавана праграма факультатыўных заняткаў «Уводзіны ў педагагічную прафесію», якая ўключае чатыры модулі: два педагагічныя і два псіхалагічныя. Тыя, хто хоча стаць настаўнікамі, пагружаюцца ў сваю будучую прафесію яшчэ ў старшых класах даведваюцца, хто такі сучасны настаўнік і якія патрабаванні да яго прад'яўляюцца.

Гэты факультатыў — не дэмаверсія педагогікі і псіхалогіі, якія яны будуць вывучаць ужо ва ўніверсітэце, але магчымасць праверыць правільнасць свайго выбару, пераканацца ў сваіх здольнасцях і схільнасцях яшчэ падчас першых педагагічных спроб, здзейсненых у школе. Трэба своечасова ставіць перад сабой пытанні: «Ці магу я? Ці хачу я?» І шчыра на іх адказваць, бо педагогіка — гэта прызванне. У педагогіцы непатрэбныя выпадковыя людзі...

Штогод каля трэці абітурыентаў, якія скончылі педагагічныя класы, атрымліваюць рэкамендацыі педсаветаў установ агульнай сярэдняй адукацыі і паступаюць у ВНУ на педагагічныя спецыяльнасці.

Між іншым, летась з 27 выпускнікоў педагагічнага класа ў сталічнай школе № 86 на спецыяльнасці, звязаныя з педагагічнай дзейнасцю, паступілі 15 чалавек. У бягучым годзе — 10 чалавек з 23.

— Канешне, мы зацікаўленыя ў тым, каб расла колькасць ахвотных стаць педагогамі, каб у школы прыходзіла змена, але гэта нельга рабіць у загадным парадку, — падзяліўся сваімі думкамі **дырэктар мінскай сярэдняй школы № 86 Аляксей СРЭБНЯК**. — Здараецца, што дзеці, якія навучаліся ў педкласах, вяртаюцца да паступлення на педспецыяльнасці не адразу, а крыху пазней, калі ўжо нельга скарыстацца дадзенымі выпускнікам педкласаў льготамі. Але прызванне бярэ сваё...

Алена Бяльніцкая ўпэўнена, што выпускнікі школы, якія выбіраюць шлях настаўніцтва, — найлепшая рэклама гэтай прафесіі для тых, хто яшчэ навучаецца ў педагагічных класах. Яны разбіваюць стэрэатыпы аб непрэстыжнасці прафесіі настаўніка, бо яны — паспяховыя, актыўныя, крэатыўныя, творчыя, ініцыятыўныя. Дзецям у фармаце «роўны — роўнаму» прасцей задаць ім свае пытанні і атрымаць адказы. Прафесія настаўніка не дазваляе стаяць на месцы — навучэнцы педагагічных класаў гэта ўжо зразумелі. Быць настаўнікам — адна з самых складаных задач, і добра, калі ў старшакласнікаў яшчэ ў школе ёсць магчымасць праверыць правільнасць свайго выбару...

Падчас канферэнцыі дзве выпускніцы сярэдняй школы № 86 Мінска — цяпер ужо **студэнткі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта Надзея ПАДАБЕД і Ангеліна МАТРУНЁНАК** — прадставілі фрагменты сваіх урокаў. Дарэчы, гэта ўстанова адукацыі з'яўляецца таксама арганізатарам раённага фестывалю педагагічных проб, мэта якога — пазнаёміць будучых педагогаў з іх патэнцыяльнымі работадаўцамі. Хтосьці з навучэнцаў педкласаў можа прыглянуцца дырэктарам школ яшчэ на гэтым этапе і атрымаць мэтавае накіраванне. А ў замацаванні педагагічных кадраў сталіца сёння асабліва зацікаўленая. Матывацыя да прафесіі — гэта, напэўна, самае важнае...

«ІМЯ ТАБЕ — НАСТАЎНІК»...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Нас падтрымалі Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт і Міністэрства адукацыі. У краіне стартаваў рэспубліканскі сацыяльна-адукацыйны праект «Педагагічныя дынастыі Беларусі». Прайшлі месяцы карпатлівай работы. Да збору і падрыхтоўкі матэрыялаў актыўна падключыліся рэгіёны: первічныя прафсаюзныя арганізацыі нашых устаноў адукацыі, абкамы, райкамы галіновага прафсаюза, рэгіянальныя інстытуты развіцця адукацыі. Удзельнікі праекта сустракаліся з будучымі героямі кнігі, вывучалі архіўныя крыніцы, сістэматызавалі атрыманыя звесткі. Першапачатковай мэтай было сабраць для друку інфармацыю пра ўсе педагагічныя дынастыі, аднак высветлілася, што ў краіне толькі па тры пакаленні маюць каля 700 з іх. Таму ў першае выданне кнігі ўвайшлі гісторыі сем'яў, якія налічваюць чатыры і больш пакаленняў, адданых настаўніцкай справе, — інфармацыя пра 129 дынастый з усіх рэгіёнаў краіны. Гэта людзі, якія зрабілі бясцэнны ўнёсак у нацыянальную сістэму адукацыі. Яны не толькі самі выхоўвалі патрыётаў і грамадзян сваёй краіны, але і далучылі да самай важнай і патрэбнай прафесіі на зямлі сваіх дзяцей і ўнукаў. Мы рады, што праект адбыўся і знайшоў водгук.

Адной з пляцовак для прэзентацыі кнігі «Імя табе — Настаўнік» стаў у сталіцы Музей Вялікай Айчыннай вайны, куды былі запрошаны прадстаўнікі 16 педагагічных дынастый Мінскай вобласці, што ўвайшлі ў выданне. Іх агульны стаж складае 6225 гадоў. Сярод іх былі як ветэраны педагагічнай працы, так і будучыя настаўнікі — студэнты педагагічных спецыяльнасцяў і профільных педагагічных класаў, якія яшчэ толькі збіраюцца працягнуць педагагічную дынастыю.

— Толькі ўявіце, колькі за гэтымі лічбамі вучняў, дзіцячых эмоцый, праведзеных сшыткаў, напісаных планаў, асабістых перажыванняў, начэй без сну. Проста неверагодная арыфметыка! І як гэта кранальна, калі родныя людзі могуць назваць адзін аднаго калегамі. Мы ведаем, што выпадковых людзей у сістэме адукацыі няма, яны там проста не затрымліваюцца, — падкрэсліла ў сваёй прамове Таццяна Якубовіч. — І месца для ўшанавання педагагічных дынастый было абрана невыпадкова. Мы знаходзімся ў будынку, які захоўвае памяць аб героях Вялікай Айчыннай вайны. А чым не героі — прадстаўнікі педагагічных дынастый? Гэта кніга — сумесная праца многіх людзей і памяць для тых, хто знаходзіцца ў гэтай зале... Я бы вельмі хацела, каб яна стала фамільнай рэліквіяй у вашых сем'ях і перадавалася з пакалення ў пакаленне.

— Педагагічныя дынастыі — гэта залаты фонд нашага грамадства, — лічыць **заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь Алена ЖУРАЎЛЁВА**. — Я ўпэўнена, што генетычная памяць не дазволіць здрадзіць фамільнаму прызванню і захаваць самае каштоўнае — веру, надзею і любоў да сваёй прафесіі... І ніякія цяжкасці не могуць прымусіць педагога ў пятым пакаленні збочыць з абранага шляху.

Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

— А калі настаўніку было лёгка? Калі Андрэй Лабановіч хадзіў па балотах Палесся? Ці калі педагогі навучалі дзяцей у партызанскіх школах? Не будзем хаваць, што мы адчуваем сёння пэўны дэфіцыт педагагічных кадраў. І каму, як не вам, якасна і эфектыўна праводзіць прафарыентацыйную работу, пачынаючы са сваёй сям'і, — звярнуўся да прадстаўнікоў педагагічных дынастый **начальнік галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінаблвыканкама Мікалай БАШКО**. — Упэўнены, калегі, што ў вашым прафесійным жыцці яшчэ будзе шмат яркіх старонак. Канешне, тыя прадметныя веды, што вы закладваеце на ўроках хіміі, біялогіі, літаратуры, вельмі важныя, але яшчэ больш важнае тое, што вы закладваеце ў дзіцячыя душы. Усё, што вы робіце, вы робіце для будучыні краіны. У нас былі складаныя пераломныя моманты, і мы ўдзячныя вам за тое, што вы захавалі сваю грамадзянскую дзяржаўную пазіцыю.

Сярод запрошаных на ўрачыстасці педагогаў быў і даўні чытач «Звязды» — **выпускнік БДПУ, настаўнікі матэматыкі і фізікі Пугачоўскай сярэдняй школы Валожынскага раёна Уладзімір Уладзіміравіч УНУЧАК**. Ён прадстаўнік дынастыі, чый педагагічны стаж набліжаецца да 500 гадоў. Заснавальнікам дынастыі з'яўляецца яго прадзед Ігнат Вікенцьевіч Станкевіч, які скончыў Санкт-Пецярбургскую настаўніцкую семінарыю ў 1913 годзе, а потым працаваў настаўнікам Капусцінскай школы ў Ашмянскім павеце.

Амаль палову стагоддзя прысвяціў выкладанню Уладзімір Уладзіміравіч. 16 гадоў ён быў дырэктарам школы. У свой 71 год вопытны настаўнік паранейшаму ў страі. Прызнаецца, што кожны верасень кажа сабе, што гэты навучальны год у яго будзе апошні. Але ён зноў і зноў вяртаецца ў школу.

«Трэба працаваць так, каб пра цябе памяталі, а памятаюць па апошнім годзе. Ну ніяк мне не ўдаецца паставіць апошнюю кропку, — усміхаецца педагог і дадае: — У нас любяць параўноўваць цяперашняе пакаленне дзяцей з папярэднімі. Навошта? Проста трэба не адставаць ад вучняў, каб заставацца для іх цікавым. Сучасныя дзеці — вельмі добрыя, творчыя, таму творчасць — важная якасць для настаўніка. Я многаму вучуся ў сваіх выхаванцаў, пастаянна займаюся самаадукацыяй, асвойваю новыя тэхналогіі. Шкада, што наша прафесія становіцца пераважна жаночай. Мужчына-педагог у школе абавязкова павінен прысутнічаць. Трэба, каб хоць палову педагагічнага калектыву складалі мужчыны-настаўнікі».

Дарэчы, жонка Уладзіміра Уладзіміравіча — таксама педагог, усё жыццё працавала настаўнікам рускай мовы і літаратуры. Цяпер яна на пенсіі. Сын — кандыдат гістарычных навук, выкладаў па сумяшчальніцтве ў вышэйшых навучальных установах сталіцы. Цяпер займаецца доктарскай дысертацыяй.

А вось **студэнтка Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Дар'я КАСЦЕНІЧ** яшчэ толькі збіраецца стаць школьным настаўнікам. «Для мяне гонар — быць членам педагагічнай дынастыі, якая вядзе свой адлік з XIX стагоддзя, — кажа яна. — Пытанне з выбарам прафесіі для мяне ніколі не стаяла. Я з дзяцінства заўсёды была акружана ў сям'і педагогамі. Ганарылася сваімі продкамі. Мае прабабуля і прадзядуля былі заслужанымі настаўнікамі Рэспублікі Беларусь. Лічу, што настаўнік — не толькі прафесія, але і прызванне. Вельмі складана быць прыкладам цярплівасці, а для мяне цярплівасць — самая галоўная якасць педагога...»

Трэба дадаць, што кніга «Імя табе — Настаўнік» — гэта толькі пачатак. Праект працягваецца, прычым магчымасць далучыцца да яго ёсць у кожнага: інфармацыю пра педагогаў, для якіх прафесія стала сямейнай справай, дакументы, фотаздымкі, аповеды калег, вучняў, сваякоў, успаміны пра сваіх настаўнікаў можна дасылаць на сайт Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. На электронным рэсурсе прафсаюза створаны раздзел, дзе пра педагагічныя дынастыі будзе ўтрымлівацца значна больш інфармацыі. А кніга носіць больш бібліяграфічны характар.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Скажыце, доктар...

ЗАБОЙНЫЯ КАНСЕРВЫ

Як правільна прыгатаваць хатнія запасы і не атруціцца імі?

БАДАЙ, самая вялікая небяспека, якая падсцерагае аматараў хатніх нарыхтовак, — рызыка заразіцца батулізмам. Гэта захворванне рэдкае, але паўсюднае. Адкуль бярэцца батулізм і як ад яго абараніцца? Расказвае ўрач-інфекцыяніст 22-й гарадской дзіцячай паліклінікі Мінска Дар'я ПЕТРАЧУК.

— Дар'я Ігараўна, што гэта за хвароба і дзе жыве бактэрыя-забойца?

— Батулізм з'яўляецца вострай харчовай токсікаінфекцыяй, якая развіваецца ў выніку пападання ў арганізм чалавека батулатаксіну. Яго сіла неверагодная, яна ў 15 000—100 000 разоў вышэйшая, чым у баявога атрутнага газу зарыну. Таксін дзейнічае як прафесійны забойца, непрыметна, ціха і бязлітасна. Ён блакіруе нервова-мышачную перадачу, і смерць надыходзіць з прычыны паралічу дыхальных мышцаў.

Асноўнай крыніцай інфекцыі з'яўляюцца жывёлы, пераважна траваедныя, а таксама птушкі, рыбы, у кішэчніку якіх Clostridium botulinus назапашваюцца ў велізарных колькасцях і выпускаюцца са спараўненнямі ў навакольнае асяроддзе, дзе ператвараюцца ў споры і могуць захоўвацца ў такім выглядзе шматлікія гады.

Асемянёнасць глебы, вады можа быць вельмі значнай. З глебы споры рызыкуюць трапіць на прадукты харчавання, у якіх пры ўзнікненні спрыяльных умоў, а менавіта без доступу паветра, могуць прарастаць і вылучаць таксін. У страўніка-кішачным тракце чалавека пад уплывам страваўльных сокаў таксін не толькі не знішчаецца, але сіла яго можа ўзрастаць у дзясяткі і сотні разоў. Часцей заражэнне адбываецца пры ўжыванні кансерваў. Прадукцыя таксіну не змяняе арганалептычных уласцівасцяў прадуктаў, можна толькі адзначыць лёгкі пах ёлкага масла.

— Якія прадукты і загатоўкі самыя небяспечныя?

— У Беларусі батулізм звязаны пераважна з ужываннем марынаваных грыбоў хатняга прыгатавання, радзей з вэнджанымі мяснымі прадуктамі, кансерваванай гароднінай і рыбай. Грыбы заўсёды багаты кантамінаванымі спорамі C. botulinum з глебы, нават пасля прамывання вадой.

Распаўсюджана памылка, што саленне грыбоў у негерметычна закаркаванай тары не прыводзіць да ўтварэння батулатаксіну. Неабходна памятаць, што пры выкарыстанні для салення вялікіх шкляных, эмаліраваных, поліэтыленавых ёмістасцяў у цэнтры грыбной масы ўтворацца бескіслародныя ўмовы, спрыяльныя для бактэрый. Характэрна нераўнамернае назапашванне таксіну, і менавіта з гэтым звязаны выпадкі выбарачнага пашкоджання батулізмам пасля ўжывання агульнага прадукту.

Часта крыніцай атручванняў становяцца такія нізкакіслотныя кансервы, як баклажанная ікра, фаршыраваны перац, марынаваныя баклажаны. З мясных прадуктаў хатняга прыгатавання найбольшую небяспеку ўяўляюць сыравэнджаныя кумпякі і каўбасы.

Гэта звязана з тым, што ў хатніх умовах могуць дапускацца санітарныя і тэхналагічныя парушэнні, якія прыводзяць да заражэння кумпякоў і каўбас узбуджальнікам батулізму, да яго размнажэння і таксінаўтварэння. Што датычыцца рыбы, то споры C. botulinum пранікаюць у кішэчнік рыб з глеем і забруджанай вадой, а калі рыба да засолкі захоўвалася ў цяпле, споры прарастаюць, і ўзбуджальнікі батулізму вылучаюць таксін. Нарыхтоўваць рыбу можна толькі вытрыбушаную.

— Захварэць можна толькі пасля ўжывання кансерваў, ці небяспечнай можа быць і свежапрыгатаваная ежа, тыя ж грыбы?

— Атручванне батулатаксінам не можа быць звязана са свежапрыгатаванай ежай, нават калі яна ўтрымлівае тэрмаўстойлівыя споры, бо тыя не могуць прарастаць у кішэчніку, што неабходна для вылучэння таксіну. Таму харчовая форма захворвання заўсёды з'яўляецца вынікам ужывання ў ежу папярэдне сфарміраванага таксіну.

Выключэнне — толькі дзіцячы батулізм, ён унікальны па сваіх праявах. У дзяцей да 1 года споры батулізму могуць прарастаць непасрэдна ў кішэчніку. Гэта адбываецца з-за аднаснага дэфіцыту ў ім страўнікавай кіслаты, паніжанага ўзроўню нармальнай мікрафлоры і няспелай імуннай сістэмы. Усё пералічанае спрыяе вытворчасці таксінаў, і таму батулізм у немаўлят можа ўзнікнуць у выніку ўжывання спор, прысутных у непрыгатаваных прадуктах, такіх як мёд.

— Як праяўляецца хвароба?

— Найбольш частымі сімптомамі харчовага батулізму з'яўляюцца дысфагія (парушэнне глытання, у тым ліку слiны) — у 96 %, сухасць у роце — 93 %, дыплапія (дваенне ў вачах) — 91 %, дызартрыя (парушэнне маўлення) — 84 %, дрэннае валоданне канечнасцямі — 73 %, востры запор — 73 %, памутненне зроку — 65 %, млоснасць — 64 %, задышка — 60 %, ваніты — 59 %, спазмы ў жываце — 42 %, дыярэя — 19 %.

Відавочна, што частку гэтых сімптомаў немагчыма праверыць у немаўлят. Таму для іх праявы крыху іншыя. Гэта неэфектыўнае смактанне, якое раптам узнікла, — 96 %, дрэннае трыманне галавы і рухі галавой — 96 %, гіпатанія шкілетных мышцаў — 93 %, слабы плач — 84 %, востры запор — 83 %, летаргія — 71 %, слабасць тваравых мышц — 69 %, раздражняльнасць — 61 %, гіпарэфлексія — 52 %, страта рухальных навыкаў — 50 %, цяжкасць дыхання — 43 %.

Клінічныя праявы хваробы могуць наступаць востра і паступова, без ліхаманкі, з сіметрычнасцю неўралагічнай сімптаматыкі і захаванасцю прытомнасці. Смерць можа наступіць на працягу сутак ад паступлення батулатаксіну ў арганізм.

Пры падазрэнні на батулізм неабходна выклікаць брыгаду хуткай дапамогі. Пакуль яна едзе, хвораму можна даць слабіцельны сродак, зрабіць прамыванне страўніка, ачышчальную клізму, даць энтрасарбенты. Дзейнічаць неабходна неадкладна, бо лячэнне заключаецца ва ўвядзенні батулінічнага анатаксіну, і ўвесці яго неабходна як мага раней.

Абараняйцеся!

1. Найлепшы метад прафілактыкі харчовага батулізму — выкананне санітарна-гігіенічных нормаў падчас прыгатавання ежы ў хатніх умовах. Шэраг рэчываў, задзейнічаных пры кансерваванні, — нітрыты, сарбітолавая кіслата, фенолавыя антыаксіданты, поліфасфаты, аскарбінавая кіслата — тармозяць рост C. botulinum і таксінаўтварэнне. Малочнакіслыя бактэрыі (Lactobacillus, Pediococcus, Lactococcus) таксама інгібіруюць рост C. botulinum дзякуючы прадукцыі кіслаты.

2. Акрамя таго, не варта ўжываць стравы, дабраякаснасць якіх выклікае сумневы. Трэба ўважліва аглядаць кансервы перад ужываннем. Надзьмутыя банкі варта неадкладна выкідваць. З хатнімі нарыхтоўкамі, калі вы не ўпэўненыя ў іх бяспецы, трэба паступаць гэтак жа. Памятайце, што батулатаксін не ўплывае на колер, смак і пах ежы.

3. Усе нарыхтаваныя хатнія прадукты перад ужываннем неабходна награваць да 85—100 ° С на працягу 5 хвілін.

4. Не варта даваць мёд дзецям да 1 года. Грудное кармленне запавольвае развіццё дзіцячага батулізму.

5. Не варта вырабляць слоічныя кансервы з мяса, рыбы, грыбоў, зеляніны.

6. Кансерваваць гародніну (агуркі, зялёны гарошак і інш.), якая не змяшчае натуральнай кіслаты, можна толькі з дабаўленнем кіслаты.

7. Важна выконваць чысціню пры апрацоўцы сыравіны, не выкарыстоўваць для кансервавання ляжалую, сапсаваную гародніну і садавіну.

8. Строга выконвайце правілы апрацоўкі слоікаў, вечкаў і рэжымаў цеплавой апрацоўкі прадуктаў у хатніх умовах.

9. Абавязкова захоўвайце хатнія кансервы пры тэмпературы 3-6 ° С, адбракоўвайце і знішчайце падазроныя слоікі.

ПІЦЬ УЧАРАШНІ ЧАЙ НЕБЯСПЕЧНА?

У часопісах аб здароўі ўсё часцей з'яўляюцца артыкулы аб тым, што чай трэба піць амаль адразу пасля заварвання. А той, які настойваўся гадзінамі, і тым больш суткі, — небяспечны. Нутрыцыёлагі таксама раяць запомніць пэўны ліміт, пасля якога чай ператвараецца ў атруту, і гэта ледзь не 15 хвілін.

А адзін з сігналаў, што чай залішне доўга настойваўся, — каламутная плёнка на паверхні. Але галоўная шкода выходзіць быццам бы ад таксіну, які няўзброеным вокам не разглядзець. Гэта гуанін — шкоднае рэчыва, якое змяшчаецца там нараўне з кафеінам. Але пасля 15 хвілін гуанін акісляецца і ператвараецца ў гуанідзін. Гэта таксічнае рэчыва.

Прычым менавіта гэтыя атрутныя ўласцівасці гуанідзіну даўно прымяняюцца ў сельскай гаспадарцы. Ім трушчаць казурак на палях, яго дадаюць у бальнічныя антысептыкі, сродкі для ачысткі труб, вадкасць для мыцця падлог, спрэі супраць цвілі. Але ва ўсіх гэтых растворах гуанідзіну — сотыя долі працэнта. Яд настолькі моцны, што ў чыстым выглядзе пакідае страшны кіслотны апёк.

А колькі ж тады гэтага рэчыва ў кубку чаю? Ці не пара пісаць пра небяспечную «пабочку» на ўпакоўках? Насамрэч таксічнага рэчыва гуанідзіну ў чаі, які настойваўся чвэрць гадзіны, шэсць гадзін і нават 12 гадзін, няма. А ўсё таму, што ў ім такіх атрутных рэчываў проста не можа быць. У ім па прыродзе няма ні гуаніну, ні гуанідзіну. Так, гэтыя рэчывы існуюць. Гуанін, напрыклад, уваходзіць у склад ДНК усіх жывых арганізмаў. А яшчэ яго шмат у лусцэ селядца і воблы. А гуанідзін атрымліваюць зусім не з гуаніну, а з каменнавугальнай смалы. І ў чаі яму таксама ўзяцца няма адкуль. Увогуле гэта толькі каламутная, як учарашняя гарбата, тэорыя змовы.

Ды і плёнка на чаі таксама зусім не сігнал, што ён ператварыўся ў атруту, гэта проста прадукт рэакцыі чайных злучэнняў з кальцыем з вадой. Калі вада цвёрдая, то плёнка будзе таўсцейшай і больш матавай. Гэта злучэнне, якое ўтвараецца ў выніку ўзаемадзеяння поліфенолаў — злучэнняў, якія прысутнічаюць у лісці гарбаты, з карбанатам кальцыю — соллю, якая змяшчаецца ў пітной водаправаднай вадзе. Плёнка бясшкодная, і робіць хіба што эстэтычнае незадавальненне.

Чай, вядома, можа нашкодзіць, але толькі калі нахімічылі яго вытворцы. А калі гарбата якасная, то дома або на прагулцы насыціць напой атрутай, завараваючы яго занадта доўга, немагчыма.

ЧАС БЫЎ СЕЯЦЬ... І ЖАЦЬ,

альбо Гэта — восень. З прадчуваннем зімы

З намі, жанчынамі, так бывае: у свае 30, 40, 60 ідзеш па вуліцы і адчуваеш, што на цябе — глядзяць (!)... Ад чаго — прычым неяк міжволі, сама па сабе — «раўнуецца спіна» і ў галаву (не сказаць, каб задраную, проста паднятую — ад зямлі) пачынаюць прыходзіць думкі, што табе, мусіць, праўда пасуе гэты плашчык, што да яго ўдала падабраліся туфлі, а потым сумка... Што сяброўка падарыла файны «танальнік», а муж — духі, што яно ўсё ж трэба раніцой выкройваць час на прычоску і макіяж... Што — урэшце — яшчэ не вечар і прыгажосць, калі яна ёсць...

Гэтае «адкрыццё» (дурань думай багацее) падбадзёрвае (ці нават акрыляе?) — нясе да найбліжэйшага люстэрка. Ты глядзішся ў яго, і першае, што бачыш, — жоўценькі, бярозавы ліст, які заблытаўся ў тваіх валасах, прыцягнуўшы тым самым позіркі. І спарадзіўшы думкі, ад якіх сапраўды «раўнуецца спіна».

Зух — супраць мух...

Ёсць спадніцы максі, ёсць — мідзі, ёсць — міні. У дзеўкі, што, задраўшы голаў, ішла напарадзе, усё змяшалася, як той казаў. Гэта значыць — левае сцягно ніжэй калена было закрытае нейкай лёгкай пышнай тканінкай (на дварэ — плюс 20), затое правае... голае — ну зусім. Спехам, відаць, прыбіралася... А вось ідзе — чамусьці памалу, нібы на шпацыр. Прыйшлося дагнаць і, амаль параўняўшыся, ціха шапнуць:

— Прабачце, у вас спаднічка задралася.

Нос у дзеўкі задраўся раней — адным знішчальным позіркам яна сказала: «Цемра егіпецкая — ну што б ты разумела!..» А ўголас яшчэ і дадала:

— Гэта фасон такі: злева — даўжэй, справа — карацей. Так задумана...

— Каб бялізну паказваць?

Толькі пасля гэтага дзеўка, мусіць, паглядзела на сябе, бо ўслед данеслася:

— Ой, як жа?.. Дзякуй!

Яны, гэтыя словы, былі да месца: добра, што сказала. Але ж куды лепш было б, каб яшчэ і зразумела, што гагарда пасуе чалавеку прыкладна гэтак жа, як... задраная спадніца.

Толькі праўду?

У калегі цешча цікавая...

Цікавая тым, што магчыма, як многія, гаворыць нават тады, калі мозг адпачывае. Ну вось пачуйце *(з тэлефона)*:

— То-ні-чак *(у Антона дзень народзінаў)*! Ты ў нас — малайчына, ты разумнік! Ты цудоўна ведаеш, што твае найлепшыя гады — ужо таго... мінулі і вельмі даўно... Але ж я ўсё роўна — віншую цябе! Жадаю...

Не ведаю, ці запомніць зяць хоць адно з пажаданняў. А вось уступ...

Знаёмы будаўнік прызнаў: калі ты гарбатаму скажаш, што ён гарбаты, то, вядома ж, не схлусіш!

Ды навошта яму твая праўда?

Не наступай!

Знаёмая вяскоўка з фінгалам, прычым класічным, пад вокам... Нельга ж не спытаць, адкуль?

— Вы не паверыце! — са смехам і, падобна, не толькі нам — пачынае расказваць жанчына. — Гэта ж я панесла курам... І яйкі забраць хацела. Толькі да гнёздаў — дзверы за спінай бразь і зачыніліся. Ведама — вецер... Дык я іх граблямі падперла. Яйкі ўзяла, на двор выходжу, а на падпорку — ужо забылася і нагой...

Тлумачальны слоўнік піша, што граблі — гэта сельскагаспадарчая прылада для зграбання сена альбо саломы. І НЕ піша, што гэта ці не адзіная рэч, якая можа... пастаяць за сябе. Ды так, каб запомніў.

Блізкія... І такія далёкія

З гадамі гэтыя двое і сапраўды сталі вядомымі артыстамі, а некалі даўно — хіба што пачыналі: падбіралі творы і творыкі, шліфавалі, маталіся з канцэртамі па гарадах і сёлах, хваляваліся, ці прадаюцца ж на іх білеты?

— А як жа?! — заверыў неяк «прымаючы бок». — Яшчэ і як прадаюцца! Але... не купляюцца.

...У знаёмцаў тая ж бяда з кватэрай: прадаецца — у ціхім месцы, у добрым стане. Пакупнікі тэлефануюць, прыходзяць, глядзяць, кажуць, што падабаецца, потым сыходзяць — з канцамі...

— Трэба, мусіць, зімы пачакаць, — уздыхаюць прадаўцы. — Бо летам у пад'ездзе ну гэтакі пах!

...Кажуць, у старажытных мовах «суседзі» і «ворагі» — паняцці адназначныя.

Эфект бумеранга

З ліста: «Смелыя цяпер жанчыны: ледзь што не па ёй — развод і дзявочае прозвішча! А некалі ж — ды ў вёсках — чаго толькі не зносілі, чаго не цярпелі, прычым — да скону.

У нас вось пара была, здалёк паглядзець, дык людзі як людзі. Муж, хіба фанабэрыўся, ён, маўляў, пры пасадзе, у кабінеце сядзіць, а ўсе, хто не, — дурні (жонка — дык і зусім).

Прылюдна крыўдзіў, нават руку падымаў...

Тая паплача, сінякі паносіць і далей жыве, бо дзе ж ты дзенешся — трое дачок, хата, гаспадарка...

Цярпела, бедная, даглядала мужа, калі той састарэў ды захварэў, пахавала, помнік паставіла — як іншыя ў вёсцы — на дваіх, каб па смерці з ім побач легчы.

А потым, трэба разумець, перадумала — іншае месца выбрала.

Апошняе слова — для сям'і закон: дзе папрасіла, там пахавалі.

Муж спачывае адзін».

...Бумеранг, калі простымі словамі, — сагнутая палка, якая мае «звычку» вяртацца да таго, хто кінуў.

Эфект бумеранга: кожны твой учынак (дрэнны ці добры) вяртаецца да цябе дабром альбо злом.

Не пры гэтым жыцці дык пры тым?

Курыце!

Справа імгненняў: дзень, сталіца, праспект, каля шапіка, што на прыпынку, — тройка малых, кураць — крадком, з рукаваў...

Пакуль прыкідваю ўзрост і думаю, што ж рабіць, — міма праносіць цётку:

— Курыце, болей курыце! — кажа яна хлапчукам, — пі...кі ніколі не вырастуць!

...Не скажу, што гэта дзяцей насцярожвае. Не скажу, што цыгаркі яны адразу патушылі — гэта будзе няпраўдай... Але ж тое, што цётку пачулі, — факт.

Як, дарэчы, і тое, што ў пэўным узросце слова, сказанае вось так, мімаходзь, і зусім чужым чалавекам, спрацоўвае куды лепш, чым самая разумная лекцыя.

Каб ведалі...

З Цвятаевай: «Нешта баліць: не зуб, не галава, не жывот, не — не — не... а баліць. Гэта і ёсць душа».

Алесіна жаночая, як і ўсякая жывая, балела шмат за што — і за родную мову, якой у горадзе амаль не чула, ад сваіх студэнтаў — і пагатоў.

«Гульню» прыдумала: падбірала цікавыя слоўцы, за хвіліну-другую да званка прасіла перакласці з рускай на беларускую ці наадварот. Правільны адказ — і ўсе свабодны. А ну *(па складах)*:

— «Меч-та...»

З месцаў:

— Мара!

— «Меч-та-тель»...

— «Марыцель» *(смех)*, «Марыльнік»... «Марак»..., «Мармон» *(рогат)*, «Уморнік»...

— Холадна, — усміхаецца выкладчыца. — Успомнім сінонімы?

— «Спадзявальнік», — адгукаюцца дзеці! — «Надзейнік», «Падзельнік»... «Фантазёр»!.. Мая бабуля сказала б: «Пустазвон», «А мая — «Балбатун — знаходка для шпіёна»...

Зрэдку і ўрэшце студэнты згадвалі патрэбнае слова, а найчасцей выкладчыца прасіла ўвагі і ціха, памалу, каб «злавілі» яго, чытала:

Ах, якая над Гайнай
купальская ноч!
Самы раз бы шукаць
кветку-папараць,
Самы раз уплятаць
летуценні ў вянок...

Яна так прыгожа чытала, што яе ніхто не спыняў: верш альбо кавалачак прозы — выдавала да канца. Пасля чаго студэнты, мусіць, на ўсё жыццё запаміналі, што «мечтатель» — гэта ж летуценнік!

...Адзін такі — пры пасадзе ўжо, двух сыноў гадуе — дом пабудаваў. На вясніцах — папярэджанне павесіў (з «фоткай» аўчаркі): «Сабака — добры, але нервы ў яго слабыя».

Папалам

Грэх на душу: калі б муж, крый божа, памёр, Вета гаравала б, напэўна, меней. А то ж кінуў... Яе — з усім нажытым дабром.... Слёзы — рэчкай!

Бацька, зразумеўшы, як цяжка дачцэ, звольніўся з работы, пераехаў да яе і насіўся — як з дзіцем: смачна карміў, забаўляў-весяліў, вадзіў у кіно, хваліў, адвозіў на работу...

Яна доўга туды збіралася: старанна рабіла макіяж і прычоску, з сукенкамі-блузкамі ішла да бацькі, пытала, у гэтай пайсці ці ў той, каб прыгожа было, каб людзі хаця не сказалі, што так ёй, лахудры, і трэба: муж правільна зрабіў, што сышоў.

Бацька — ва ўборы — спярша не дужа ўнікаў — казаў: «Во всех ты, душечка, нарядах хораша!», але ж потым адчуў, што цяпер дачцэ гэта важна: стаў думаць ды падказваць, у чым сёння будзе цяплей і зручней, у чым — прыгажэй.

Яны дружна жылі і пакуль што жывуць. Дачка — амаль ачуняла: «на нервах» да гэтай зімы бацьку світар цёплы звязала.

Вечарам ён прыбраўся, паглядзеў у люстэрка, пагладзіў сябе па баках, па пузе.

Дачка спытала:

— Ну як?

— Класна! Заўтра ў ім у краму пайду — пагляджу, што людзі скажуць.

Падкалоў, карацей. Разам пасмяяліся.

...Гэта і сапраўды: шчасце ніколі не змяншаецца, калі яго раздзяляюць, а вось гора — здаецца, так?

Кадры вырашаюць усё

У прыяцелькі дзве даты, і ў адначассе, можна сказаць: юбілей — 50 гадоў і 30 — на адным прадпрыемстве. Цікава ж, як святкавала?

— Ой, — махае рукамі, — лепш не пытайцеся...

Але ж — распавядае шчыра, як на духу: ну, што дзяўчаты (яе каляжанкі), як водзіцца, скінуліся — купілі падарунак. Яна — адпаведна — цукерак і шампанскага. А дома спякла пірог... Як сваё начальства віншавала і як ад вышэйшага «пасланнік» з'явіўся. Праўда, незнаёмы і зусім малады («яны там як пальчаткі мяняюцца»), але ж прамову трымаў — і чым чынам. Казаў, прынамсі, што ў яе працоўнай кніжцы — безліч адзнак і толькі адно месца працы, што яна — майстар, што дзякуючы ім, вось такім, прадпрыемства трымаецца і, напэўна, будзе... Моцнага здароўя жадаў, уручыў галінку хрызантэм і канверцік...

Потым, што юбілярку здзівіла, прыняў запрашэнне за стол. І ўжо там за шампанскім (да слова прыйшлося) выдаў, мусіць, тое, што сапраўды хацеў. Сказаў: ну цяпер вам пяцьдзясят, гэта ўзрост, і на іншую работу вас хутчэй за ўсё проста не возьмуць. Але ж на вось гэтай «па-нармальнаму не плацілі ніколі»! Дык чаго тут сядзець было?! Цэлых 30 гадоў...

— Хацела яму сказаць, — смяецца жанчына, — што прырасла, прывыкла да людзей, што ў наш час не модна было пераходзіць з месца на месца...

У ягоны — падобна — не модна сядзець.

Форс марозу не баіцца?

Напрадвесні ды ў пачатку восені і сапраўды прасцей адрозніць людзей разважлівых ад легкадумных. Што да жанчын, то першыя ў шапках, другія — з прычоскамі.

Што да мужчын, то разумныя ў портках, а не вельмі — па холадзе — у... шортах, бо ногі — ад костачак і вышэй — у модных цяпер наколках. Грошы на іх патрачаны. Трэба ж пафарсіць, паказаць, на што?

Пайсці... І застацца!

Сямёнаўне шчасціла — як тому тапельцу: рана аўдавела сама — цягнула дзяцей, рана аўдавеў сын — цягнула ўнучак, а да ўсяго — нялёгкую работу, няблізкую дачу. Людзі, здаралася, дапамагалі ёй, а ўжо яна — чым толькі магла!.. І каму...

Нам гадоў нашцаць таму кусцік руж «перапаў» — прыжыўся, стойка перанёс першую зіму і ўсе наступныя, разрослся... Аж да ліставпада часам цвіце! І як жа хораша!

Схіліцца, каб палюбавацца, панюхаць, і шкада згадаеш-паклонішся: рэдкая жанчына была!

І засталася, бо нехта недурны сказаў: «Я не ведаю, куды людзі трапляюць пасля смерці, але я дакладна ведаю, дзе яны застаюцца... Тыя, каго ты любіш, заўсёды з табой».

Гэта — восень

...Светлы элегантны касцюмчык, крэмавыя «шпілечкі», яркая, у тон ім, касынка.

— Вы пасля работы ў тэатр? — пытаюся ў суседкі.

Тая адной усмешкай дзякуе за камплімент — на імгненне святлее тварам — і тут жа цямнее:

— Не, на жаль... На пенсію адпраўляюць — апошнія дні на работу хаджу. Дык во — штодня прыбіраюся, сукенкі выгульваю, бо куды ў іх пасля, не скажаце?

...Светлы элегантны касцюм, крэмавыя «шпілечкі», яркая, у тон, касынка... Гэта — бывае — восень. З прадчуваннем доўгай зімы.

Валянціна ДОЎНАР.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
11 кастрычніка 2023 г. № 37 (723)
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

З КЛОПАТАМ АБ ЧАЛАВЕКУ І НАВАКОЛЬНЫМ АСЯРОДДЗІ

Якія змены чакаюць сферу аховы здароўя і раслінны свет?

У панядзелак, падчас пасяджэння 11-й сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу сёмага склікання, сенатары адобрылі шэраг законапраектаў. Сярод іх — «Аб змяненні законаў па пытаннях аховы здароўя» і «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб каранціне і абароне раслін».

Фота БелТА

Ад падрыхтоўкі кадраў да дапамогі пацыентам

Праект Закона «Аб змене законаў па пытаннях аховы здароўя» накіраваны на ўдасканаленне прававых норм па пытаннях аказання медыцынскай дапамогі, кантролю за медыцынскай дзейнасцю, а таксама прафесійнай падрыхтоўкі медыцынскіх і фармацэўтычных супрацоўнікаў.

Асноўныя новаўвядзенні членам Савета Рэспублікі прадставіла **першы намеснік міністра аховы здароўя Алена КРАТКОВА**. Па-першае, заканадаўча замацоўваецца магчымасць забеспячэння за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовага бюджэту асобных катэгорый пацыентаў з анкалагічнымі і іншымі захворваннямі лекавымі сродкамі, не ўключанымі ў Рэспубліканскі фармуляр лекавых сродкаў. Пералік такіх захворванняў будзе вызначаны Міністэрствам аховы здароўя.

«Па-другое, увага ўдзелена пытанням якасці і эфектыўнасці медыцынскіх вырабаў, — адзначыла першы намеснік міністра. — У законе ўпершыню дадзены вызначэнні няякасных кантрафактных і фальсіфікаваных медыцынскіх вырабаў. У адпаведнасці са змяненнямі, якія ўносяцца, будзе арганізаваны дзяржаўны нагляд за абарачэннем медыцынскіх вырабаў. Яго ажыццяўленне ўскладаецца на дзяржаўную ўстанову «Дзяржфармнагляд», паўнамоцтвы якой пашырацца».

Трэцяя навацыя законапраекта звязана з увядзеннем добраахвотнай медыцынскай акрэдытацыі арганізацый аховы здароўя на адпаведнасць нацыянальным крытэрыям медыцынскай акрэдытацыі, сутнасць якой — выяўленне недахопаў і іх ліквідацыя. Паўнамоцтвамі па ўстанаўленні асаблівасцяў фінансавання дзяржаўных арганізацый аховы здароўя, якія не прайшлі медыцынскую акрэдытацыю, а таксама па рэгуляванні пытанняў медыка-сацыяльнай рэабілітацыі асоб, якія пакутуюць на сіндром залежнасці ад наркалагічных і іншых псіхаактыўных рэчываў, надзяляецца Савет Міністраў. Гэта чацвёртае новаўвядзенне.

Пятая навацыя датычыцца накіравання за межы нашай краіны ўзораў біялагічных матэрыялаў грамадзян Рэспублікі Беларусь з мэтай дыягностыкі ў выпадку немагчымасці аказання неабходнай медыцынскай дапамогі ў Беларусі. «Дазволеная задача ўзнікае пры неабходнасці выканання пацыенту спецыфічных дыягнастычных даследаванняў, часцей за ўсё медыка-генетычных, якія даступныя толькі за межамі Рэспублікі Беларусь», — удакладніла Алена Краткова.

Па-шостае, праектам комплексна ўрэгуляваны асаблівасці падрыхтоўкі спецыялістаў у клінічнай ардынатуры. Яна будзе ажыццяўляцца па спецыяльнасцях тэрапеўтычнага і хірургічнага профіляў. Пасля падрыхтоўкі ўрачы-спецыялісты дапускаюцца да аказання спецыялізаванай высокатэхналагічнай медыцынскай дапамогі, а таксама змогуць памяняць свой профіль медыцынскай спецыяльнасці. У праекце знайшлі адлюстраванне тэрміны праходжання падрыхтоўкі ў клінічнай ардынатуры, яе змест, пытанні адбору, фінансавання і іншае. Прадугледжана абавязковая адпрацоўка — не менш як пяць гадоў.

Як падкрэсліў **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ігар КАСКО**, усе змяненні вельмі важныя як для насельніцтва, так і для медыцынскай супольнасці. Па яго словах, навелы, якія будуць дадаткова ўнесены ў Закон «Аб ахове здароўя», накіраваныя ў першую чаргу на павышэнне якасці і даступнасці медыцынскай дапамогі насельніцтву краіны. «На заканадаўчым узроўні змяненні вырашаюць шэраг праблемных пытанняў, якія былі не вырашаны да гэтага часу», — рэзюмаваў парламентарый.

Санітарны і экалагічны фон — пад кантролем

Пра сутнасць змяненняў Закона Рэспублікі Беларусь «Аб каранціне і абароне раслін» сенатарам распавёў **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Сяргей БАРТАШ**. «Законапраект накіраваны на ўніфікацыю, гарманізацыю і збліжэнне заканадаўстваў Рэспублікі Беларусі з заканадаўствам Расійскай Федэрацыі ў рамках рэалізацыі Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, а таксама з улікам палажэнняў Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе, іншых нарматыўна-прававых актаў ЕАЭС і заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь, удакладненне сфер кантрольнай дзейнасці», — звярнуў увагу кіраўнік ведамства.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Заканадаўчыя навацыі, дыялог пакаленняў і дабрачыннасць

Падрабязнасці працоўнага тыдня сенатараў

● Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец прыняла ўдзел у круглым стале на тэму «Удасканаленне прававога рэгулявання дзяржаўных закупак тавараў (работ, паслуг)». Арганізатарамі выступілі Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы і Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Наталля Васілеўская прадставіла навелы прынятага дэпутатамі ў першым чытанні праекта Закона Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных закупках тавараў (работ, паслуг)», якія накіраваны на спрашчэнне працэдур дзяржзакупак і забеспячэнне эфектыўнага расходавання бюджэтных сродкаў, у тым ліку праз мінімізацыю злоўжыванняў і пасрэдніцтва. Выступаючы перад удзельнікамі, Таццяна Рунец закранула такія пытанні, як галіновае рэгуляванне закупак, удзел у закупках афіляваных асоб, правядзенне закупак з адной крыніцы, устанаўленне гранічнай цаны, а таксама падкрэсліла неабходнасць узгаднення норм праекта з падрыхтаванымі зменнямі ў заканадаўстве аб прадпрымальніцкай дзейнасці. Законапраект двойчы разглядаўся экспертным саветам пры Савеце Рэспублікі, пасля чаго быў істотна дапрацаваны. Выказаныя падчас круглага стала заўвагі і прапановы будуць разгледжаны дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў. Цяпер ідзе актыўная падрыхтоўка дакумента да прыняцця ў другім чытанні.

● Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, старшыня Гродзенскага аб'яднання прафсаюзаў Віктар Лісковіч прыняў удзел у дыялогавай пляцоўцы «Дыялог пакаленняў», якая сабрала ветэранаў працы розных галін эканомікі, старшынь галіновых прафсаюзаў абласцей, маладзёжны прафактыў. Мерапрыемства прайшло па ініцыятыве Гродзенскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў і было прымеркавана да Дня пажылых людзей. У агратурыстычны комплекс «Каробчыцы» прыйшлі людзі розных узростаў, прафесій і поглядаў, аб'яднаных любоўю да Радзімы і сваёй справы. Прадстаўнікі розных пакаленняў падзяліліся жыццёвым вопытам, расказалі аб сваім першым працоўным месцы, аб тым, з якімі цяжкасцямі тады давялося сутыкнуцца. «Наша сустрэча стала дадатковай нагодай згадаць найлепшае, што было ў прафсаюзным актыве, даведацца, чым жыве сёння моладзь, як яна ўспрымае прафсаюзны рух, — адзначыў Віктар Лісковіч. — Важна ўспомніць і тыя традыцыі, на якіх раслі і выхоўваліся ў свой час людзі старэйшага ўзросту. Важна не страціць тое найлепшае, што можа прынесці сёння карысць у рабоце з маладымі людзьмі. Глыбока перакананы, што ў нас цудоўная моладзь. Яна гэтак жа любіць сваіх родных, блізкіх і, вядома, краіну, у якой жыве». У рамках мерапрыемства былі арганізаваны творчыя конкурсы. Сенатар выказаў упэўненасць у тым, што мерапрыемства аб'яднала ўдзельнікаў дыялогу ў імкненні да захавання гістарычнай памяці і традыцыйных каштоўнасцяў беларускага народа.

● Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, намеснік дырэктара па развіцці прадпрыемства «Контэ Спа»» Валянцін Байко наведаў Ваўкавыскі раённы дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў. Пастаяльцам дома-інтэрната сенатар перадаў велатрэнажор і акустычную сістэму. «Падапечныя дома-інтэрната са сваімі асаблівасцямі характару, звычкамі, таму вельмі важны клопат, увага, цяпло і паважлівае стаўленне да іх, — заўважыў парламентарый. — Вельмі важна ім дарыць часцінку душы, дапамагаць і падтрымліваць. Такія сустрэчы садзейнічаюць умацаванню іх бадзёрасці духу і прыемна радуюць».

Вераніка КАНЮТА.

З КЛОПАТАМ АБ ЧАЛАВЕКУ І НАВАКОЛЬНЫМ АСЯРОДДЗІ

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Прадугледжваецца ажыццяўленне ўвозу ў нашу краіну падкаранцінная прадукцыі з замежных дзяржаў, дзе выяўлена распаўсюджванне каранцінных аб'ектаў па выніках кантролю ў месцах вытворчасці, адгрузкі насенняга і пасадачнага матэрыялу, за выключэннем увозу з дзяржаў — удзельніц Еўразійскага эканамічнага саюза. Выключаецца ліцэнзаванне, і ўводзіцца паведамляльны прынцып ажыццяўлення аптовага гандлю сродкамі аховы раслін для суб'ектаў гаспадарання, якія займаюцца такой дзейнасцю. Рэгламентуецца функцыянаванне аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы «БЕЛФІТА» ў мэтах удасканалення ўліку падкаранцінная прадукцыі, яе нагляду пры ўвозе, вывазе і перамяшчэнні па мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза і забеспячэння інфармацыйнага ўзаемадзеяння паміж дзяржавамі ў рамках фітасанітарнага кантролю ў адпаведнасці з Міжнароднай канвенцыяй па каранціне і абароне раслін. Нагляд у галіне каранціну і аховы раслін ускладаецца на дзяржаўную ўстанову «Галоўная дзяржаўная інспекцыя па насенняводстве, каранціне і абароне раслін». Устанаўліваецца патрабаванне аб недапушчэнні да рэалізацыі сродкаў аховы раслін пасля заканчэння тэрміну дзеяння пасведчання іх дзяржаўнай рэгістрацыі або спынення дзяржаўнай рэгістрацыі, а таксама тых, хто прыйшоў у непрыдатнасць, і (або) забароненых да прымянення сродкаў аховы раслін.

Як нагадаў **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Алег СЛІНЬКО**, папярэдні раз змяненні ў Закон «Аб каранціне і абароне раслін» прымаліся ў 2005 годзе. «За гэты час адбывалася змена шматлікіх нарматыўна-заканадаўчых актаў, змяняліся некаторыя міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь, — дадаў ён. — У сувязі з гэтым і ёсць неабходнасць прыняць новы закон. Змяненні не глабальныя, але, тым не менш, некаторыя з іх ёсць. Так напрыклад, адмяняецца парадак ліцэнзавання, прымяняецца заяўны прынцып у сферы аптовага гандлю сродкамі індывідуальнай аховы раслін. Таксама ўстанаўліваюцца патрабаванні да выкарыстання сродкаў аховы раслін, у якіх скончылася дзяржаўная рэгістрацыя, а таксама зваротаў з тымі сродкамі аховы, у якіх скончыўся тэрмін прыдатнасці».

Вераніка КАНЮТА.

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

ІДЭІ КЛІЧУЦЬ

Лоеўскія дэпутаты прымаюць актыўны ўдзел у добраўпарадкаванні гарадскога пасёлка

У Лоеве сёння — у фінальнай стадыі праект па стварэнні варкаўт-пляцоўкі «Для ўсёй сям'і», якая размесціцца ў цэнтры гарпасёлка. Стварэнне менавіта гэтага аб'екта прапанавалі да ўдзелу ў другім сезоне рэспубліканскага конкурсу маладзёжных ініцыятыў. Праект лоеўскай моладзі — адзін з пераможцаў. Увогуле ж, сёння жыхары раёна, улады, дэпутаты гатовы разам брацца за ажыццяўленне самых розных праектаў. Што ўжо зроблена, змагла ацаніць карэспандэнт «Звязды».

Як увасобіць у жыццё ідэю не толькі жаданую, але і сацыяльна значную для свайго населенага пункта? Моладзь Лоеўшчыны сёння можа смела пераймаць вопыт дэпутатаў раёна. У цэнтры Лоева сучасныя вулічныя трэнажоры для заняткаў спортам на свежым паветры з'явілася дзякуючы сумеснай рабоце Лоеўскага раённага Савета дэпутатаў і жыхароў гарадскога пасёлка.

Грамадскія ініцыятывы, накіраваныя на папулярызацыю спорту, здаровага ладу жыцця і актыўнага гасцей гарадскога пасёлка тэрыторыя набярэжнай, знакамітая цэнтральная плошча Лоева, алея Герояў і музей «Бітвы за Днепр» і адкрытая пляцоўка баявой тэхнікі каля набярэжнай.

Між тым тут жа, у цэнтры гарпасёлка, праходзяць урачыстыя выязныя рэгістрацыі шлюбаў жыхароў не толькі Лоеўскага раёна, але і суседніх.

— Алея Герояў, манумент Славы — асаблівае месца для жыхароў і гасцей Лоева. Да гэтага часу захоўваецца традыцыя, калі маладыя пасля рэгістрацыі шлюбу тройчы аб'язджаюць плошчу і аддаюць даніну павагі героям-вызваліцелям, — дадае Ірына Мікалаеўна.

Папулярнае ў маладых падчас урачыстых выязных рэгістрацый шлюбаў «Сямейнае дрэва» — сёння любімая фотазона лаяўчан.

Сіламі яе каманды дэпутатаў раённага Савета дэпутатаў каля гарадскога цэнтра культуры Лоева «расце» і цешыць вока сямейнае дрэва. Такі падарунак за ўласныя сродкі народныя абраннікі зрабілі жыхарам раёна да Дня горада год таму. На арыгінальнай каванай кампазіцыю замочкі пакідаюць маладыя. Дрэва, дарэчы, па замове дэпутатаў зрабіў вядомы жыхар Лоева — былы ўрач-хірург, які цяпер займаецца аўтарскай коўкай.

Трэнажоры для заняткаў спортам на свежым паветры з'явіліся дзякуючы намаганням дэпутатаў і жыхароў Лоева.

> Грамадскія ініцыятывы, накіраваныя на папулярызацыю спорту, здаровага ладу жыцця і актыўнага сямейнага адпачынку, увогуле на добраўпарадкаванне свайго населенага пункту — адны з самых папулярных сярод жыхароў раёна.

— Лоеўскі раённы Савет дэпутатаў значную ўвагу ўдзяляе патрыятычнаму выхаванню, захаванню гісторыка-культурнай спадчыны. Мы прымаем актыўны ўдзел у дыялогавых пляцоўках, прысвечаных гэтай тэматыцы. Сумеснымі намаганнямі органаў улады, дэпутатаў і мясцовых жыхароў музей пад адкрытым небам на набярэжнай і інфраструктура навокал падтрымліваецца ў належным стане. Цяпер дэпутаты райсавета адобрылі ініцыятыву жыхароў Лоева ў арганізацыі суботніка, прымеркаванага да 80-годдзя вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Хацелася да свята абнавіць знешні выгляд ваеннай тэхнікі музея пад адкрытым небам. Дапамогу нам аказаў у тым ліку ваенны камісарыят Гомельскай вобласці і грамадскае аб'яднанне «Белая Русь», — адзначыла старшыня Лоеўскага раённага Савета дэпутатаў.

Хоць маленькімі крокамі, але таксама наперад, да сваёй мары — ажыццявіць патрыятычныя праекты, добраўпарадкоўваць родны сельскі Савет, ідуць актывісты і на вёсцы. Сёлета ў сельскіх населеных пунктах удалося ўвасобіць у жыццё дзве грамадскія ініцыятывы.

— Мясцовыя жыхары вёскі Глушэц Бывалькаўскага сельсавета адрэстаўрыравалі мемарыял і брацкае пахаванне воінаў-землякоў, добраўпарадкавалі прылеглую тэрыторыю, — звярнула ўвагу Ірына Пастухова. — У вёсцы Мохаў Каўпенскага сельсавета дзякуючы грамадскай ініцыятыве адноўлены помнік былому дырэктару Мохаўскай сярэдняй школы, ветэрану Вялікай Айчыннай, які прайшоў усю вайну, меў высокія дзяржузнагароды за перамогу над фашызмам, — Мікалаю Мікалаевічу Шаталаву, — дадае дэпутат.

Дарэчы, у гэтай грамадскай ініцыятыве вяскоўцаў Мохава падтрымалі кіраўніцтва Лоеўскага раёна, аддзел адукацыі, спорту і турызму райвыканкама, старшыня Каўпенскага сельвыканкама Людміла Прымак, дырэктары школ Лоеўшчыны, ветэраны педагагічнай працы.

Дэпутаты Страдубскага сельскага Савета дэпутатаў цяпер рыхтуюцца падтрымаць ініцыятыву ў пасёлку Суткова: вясковую існуючую гульнявую зону дапоўняць спецыялізаванай дзіцячай пляцоўкай. Першым за справу ўзяўся дэпутат Страдубскага сельскага Савета дэпутатаў, ляснічы Лоеўскага даследнага лясніцтва ДЛГУ «Лоеўскі лясгас» Сяргей Асташоў. Сам шматдзетны бацька, дэпутат прымае актыўны ўдзел у добраўпарадкаванні сваёй малой радзімы. З піламатэрыялаў сваімі рукамі ён зрабіў невялікую дзіцячую гульнявую зону. Бацькі вельмі ўдзячныя свайму земляку. Цяпер жа дэпутаты Страдубскага сельскага Савета дэпутатаў вырашылі падтрымаць Сяргей Асташова і таксама паўдзельнічаць у далейшым добраўпарадкаванні тэрыторыі пасёлка.

Між тым цяпер на вялікую радасць жыхароў Лоеўшчыны раённым Саветам дэпутатаў распрацавана грамадская ініцыятыва па адкрыцці першай у раёне рэзідэнцыі Дзеда Мароза. Увасобіць ідэю плануецца не ў райцэнтры, а на вёсцы — на тэрыторыі Бывалькаўскага сельсавета. Гэты праект ад Лоеўскага раёна будзе заяўлены на конкурс грамадскіх ініцыятыў Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

З чаго пачынаецца Радзіма

Быць патрыётам — не складана, а цікава

У невялікай вясковай школе імя М. Я. Раманькова ў Вендаражы Магілёўскага раёна вучацца 133 чалавекі з вёсак сельсавета плюс 30 выхаванцаў дзіцячага садка. І ўсе яны без выключэння ведаюць, што такое Радзіма і за што яе трэба любіць. Кіраўніцтва школы і настаўнікі арганізоўваюць для сваіх падапечных экскурсіі па месцах баявой славы, ходзяць з імі ў «Зорныя паходы». У школе ёсць музейны пакой, на тэрыторыі ўстаноўлены стэнд з фотаздымкамі тых, хто змагаўся за Радзіму, на сцяне школы — мемарыяльная дошка ў гонар Героя Савецкага Саюза Міхаіла Раманькова, ураджэнца гэтых мясцін, імя якога носіць установа. Пасвячэнне старшакласнікаў у пошукавікі стала яшчэ адной падзеяй, накіраванай на выхаванне пачуцця адказнасці і патрыятызму.

Наколькі сур'ёзнае гэта мерапрыемства, можна было меркаваць па прысутнасці прадстаўнікоў кіраўніцтва раёна, дэпутатаў і нават генерала-маёра Пятра Ціханоўскага, які з 2009 да 2013 года быў начальнікам Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першым намеснікам міністра абароны краіны. На пляцоўцы каля школы сабраліся настаўнікі, навучэнцы, іх бацькі, госці. Узняты сцяг, гучыць гімн, усё вельмі ўрачыста і ўзнёсла.

— Сёння мы закладваем пачатак штогадовай традыцыі пасвячэння самых актыўных навучэнцаў у пошукавікі, — голас **дырэктара школы Вячаслава АРЛОЎСКАГА** гучыць дакладна і ўзвышана. — Два гады таму дзякуючы настаўніку хіміі і біялогіі Андрэю Турэмскаму з'явілася аб'яднанне па інтарэсах па пошукавай дзейнасці. Пачыналі з тэарэтычнай падрыхтоўкі, вывучалі гераічныя старонкі сваёй малой радзімы, потым удзельнічалі ў паходах, наведвалі месцы баёў, прымалі ўдзел у перапахаваннях чырвонаармейцаў. Прыйшоў час нашых пошукавікаў афарміць у групу. 12 актывістаў атрымаюць знакі адрознення і прыналежнасці да групы «Аўрора». За форму асабісты дзякуй абласному аб'яднанню прафсаюзаў, «Магатэксу», «Белай Русі», дэпутатам.

Пошукавікам жадаюць натхнення, бадзёрасці духа і быць заўсёды цікаўнымі і неабыякавымі да радзімы. Вельмі хвалюючы момант прынясення ўрачыстай клятвы. Пад каманды кіраўніка групы Андрэя Турэмскага падлеткі выходзяць на сярэдзіну пляцоўкі, дзе прамаўляюць словы клятвы. За імі назіраюць дзясяткі цікаўных дзіцячых вачэй, у тым ліку самых маленькіх. На тварах апошніх асабліва чытаецца шчырае захапленне. Ну якія ж прыгожыя гэтыя амаль ужо зусім дарослыя хлопцы і дзяўчаты.

— У нас не можа быць інакш, нават тэрыторыя, дзе знаходзіцца школа, гераічная, — кажа **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Святлана САВЕЛЬЕВА**. — Тут адбываліся трагічныя падзеі. На тэрыторыі Вендаражскага сельсавета была спаленая вёска Дубінка. Настаўнікі разам з дзецьмі займаюцца добраўпарадкаваннем кургана ў гэтай вёсцы і шэфствуюць над мясцовымі воінскімі пахаваннямі. Хлопцы і дзяўчаты прымаюць удзел у раскопках па ўсёй Магілёўскай вобласці. Мы мэтанакіравана займаемся патрыятычным выхаваннем і лічым, што гэта прэстыжна.

Летась школа стала насіць імя Героя Савецкага Саюза Міхаіла Раманькова, ён атрымаў гэта высокае званне на франтах Вялікай Айчыннай у 19 гадоў. Сам ён родам з тутэйшай вёскі Дубінка. Настаўнікі з вучнямі правялі вялікую даследчую работу, вынікам якой і стала прысваенне школе імя героя. Да гэтага па ініцыятыве дырэктара ў школьным дварэ з'явілася Сцяна памяці, на якой размешчаны партрэты 80 ураджэнцаў Вендаражскага сельсавета — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. І тых, якія загінулі, і тых, якім пашчасціла вярнуцца ў свае сем'і і будаваць мірнае жыццё. Што датычыцца музейнага пакоя, то ён не мог не ўзнікнуць, бо падчас даследаванняў было знойдзена шмат цікавай інфармацыі і экспанатаў. Сярод іх — камень з Брэсцкай крэпасці, сертыфікат, што зямля была ўзятая на гэтым гераічным месцы. Ёсць экспазіцыя, прысвечаная спаленым вёскам. Асабістыя рэчы, якія належалі партызанам. Зроблены макет, на якім паказаны ўсе вёскі, якія пацярпелі ад немцаў. Там цяпер помнікі і памятныя знакі.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Наталля ТАРАСЕНКА лічыць гэтую школу адной з узорных у плане выхавання патрыётаў. На ўрачыстым мерапрыемстве яна ўручыла калектыву школы Падзяку дэпутата за гэтую важную місію.

— У школе ёсць музейны пакой, з'явіўся пошукавы атрад, а гэта гаворыць пра тое, што кожны ваш педагог і навучэнец любіць сваю радзіму, — звярнулася яна да прысутных. — Хочацца пажадаць і надалей захоўваць памяць пра сваю зямлю, пра герояў, якія абаранялі зямлю ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Ведайце і навучыце потым сваіх дзяцей любіць Радзіму. Мы добра памятаем словы Прэзідэнта, што патрыёта можа выхаваць толькі патрыёт. У гэтым калектыве сапраўды працуюць патрыёты нашай радзімы.

Удзел у школьным свяце браў **генерал-маёр Пётр Мікалаевіч ЦІХАНОЎСКІ**, які звярнуў увагу на важнасць той місіі, якой займаецца школа. Ён падкрэсліў, што ў Беларусі створана магутная сістэма бяспекі і добра, што ёсць такая моладзь, якая здольная яе ўмацаваць.

— Вам ёсць чым ганарыцца, ваша школа носіць імя героя. У вашай мясцовасці жылі і жывуць сапраўдныя героі, якія і падчас вайны, і ў мірны час аддавалі ўсе свае сілы на карысць краіны, — аргументаваў ён.

Кіраўнік пошукавага атрада «Аўрора», настаўнік хіміі і біялогіі і кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні Вендаражскай школы Андрэй ТУРЭМСКІ — таксама нашчадак Героя Савецкага Саюза Гаўрыіла Маісеенкі. Ён шмат чуў пра яго ад бацькоў і вельмі ім ганарыцца. Настаўнік яшчэ і пошукавік абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віктар» — не дзіўна, што і сваіх вучняў захапіў гэтай дзейнасцю.

— У нашым аб'яднанні па інтарэсах вывучаем гісторыю Беларусі, — адзначыў ён. — Працуем з архіўнымі дакументамі, данясеннямі, мемарыяльнымі базамі. Паколькі ў нас на тэрыторыі сельсавета шмат воінскіх пахаванняў, звяраем прозвішчы, каб не было памылак, і разам з пошукавым клубам «Віктар» і 52-м асобным батальёнам Мінабароны выязджаем на палявыя вахты. Падлеткі непасрэдна пошукам не займаюцца, яны задзейнічаны ў дапамозе пры падняцці астанкаў, правяраюць зямлю на наяўнасць дробных металічных прадметаў. І пасля вахтаў памяці ўдзельнічаюць у цырымоніях перапахавання. Важна, каб яны ведалі гэты шлях ад пачатку да канца і мелі нейкае ўяўленне пра нашу дзейнасць.

На тэрыторыі Вендаражскага сельсавета болей чым дзе воінскіх пахаванняў. Але ўсе яны пад надзейным даглядам.

— Калі трэба дапамога па навядзенні парадку на воінскім пахаванні, школьнікі адразу ж адгукаюцца, — расказвае **выконваючая абавязкі старшыні Вендаражскага сельсавета Ганна ЗАЙЦАВА**. — Дзецям цікава займацца пошукавай справай. З іх атрымаюцца не проста добрыя грамадзяне, а патрыёты. Яны шануюць памяць нашых герояў. Летась разам са сваім кіраўніком прайшлі па месцах воінскай славы 17 кіламетраў, і ім было вельмі цікава. Дзеці разумеюць, наколькі важныя гэтыя месцы.

Дэпутат Магілёўскага райсавета Дзяніс МІХАСЁЎ — выпускнік Вендаражскай школы. Як і яго жонка Ганна. Тут вучацца і двое іх сыноў, Кірыл і Аляксей. Кірыл — адзін з тых, каго пасвяцілі ў пошукавікі. А Аляксей, яшчэ першакласнік, з зайздрасцю назіраў, як брату ўручаюць знакі адрознення.

— З гэтага і пачынаецца патрыятызм, — перакананы Дзяніс Міхасёў. — Малодшаму сыну пакуль цікавая прыгожая форма, урачыстасць, нейкія знешнія формы. Але паступова ён пачынае разумець сутнасць справы і захапляецца гэтым пачуццём. Старэйшы сын — гэта той самы прыклад, як з дзіцяці вырастае патрыёт. Ён актывіст, удзельнічае ў спартыўных мерапрыемствах, алімпіядах. Вельмі вялікі ўплыў на школьнікаў аказваюць настаўнікі школы. Яны іх арыентуюць і накіроўваюць. Дзякуючы настаўніцы Вікторыі Кавалеўскай, Кірыл удзельнічаў у міжнародным конкурсе, пісаў ліст свайму прадзеду-франтавіку. Яго работа была адзначана як адна з найлепшых. І цяпер у пошукавую групу прымалі сапраўды самых лепшых і актыўных. Гэтыя маладыя пошукавікі — прыклад для астатніх у вучобе, дысцыпліне і грамадскай дзейнасці. Мы з жонкай заўсёды падтрымліваем праекты гэтай школы, бо ведаем, што яны сапраўды карысныя і працуюць.

Дырэктар школы Вячаслаў Арлоўскі перакананы, што патрыятызм трэба выхоўваць з дзяцінства. І проста словы тут не працуюць. Тут важныя справы. На мерапрыемстве ён уручыў камандзірам піянерскіх атрадаў заданні, каб напрыканцы навучальнага года атрымаць ад іх справаздачу. Заданні нескладаныя. Трэба ўдзельнічаць у акцыях, добрых справах, навядзенні парадку на тэрыторыі школы і памятных месцах, дапамагаць даглядаць дрэвы ў «Садзе Надзеі»... Толькі цяпер гэта не проста акцыі і заданні, а яшчэ і адказнасць. Ад цябе чакаюць канкрэтных спраў і слоў. Бо вядома, што, калі нешта прагаворваеш услых, гэта хутчэй даходзіць да сэрца.

Эліна Марус яшчэ трэцякласніца. Але першыя ўрокі патрыятызму для сябе засвоіла добра. Дзяўчынка лічыць, што для гэтага шмат не трэба. Проста неабходна заставацца чалавекам у любой сітуацыі. Нельга лічыць, што ад цябе нічога не залежыць. На мерапрыемстве яна дуэтам з яшчэ адной дзяўчынкай спявала песню «Дзень без стрэлу на зямлі». І нават не паказвала выгляду, што выступае з гіпсам. А яшчэ Эліна прызналася, што разам з маці паўдзельнічала ў дабрачынным праекце па дапамозе радзільнаму дому Марыупаля, да якога далучылася школа. У Магілёўскай вобласці ініцыятарамі праекта «Дапамога дзецям Данбаса — эстафета дабра», які праводзіць дабрачынны фонд Аляксея Талая, выступілі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Наталля Тарасенка і Людміла Здорыкава.

— Мы хочам, каб першы падарунак для маленькага жыхара Данбаса быў менавіта з мірнай краіны, і мы дзелімся дабром, — рэзюмуе Наталля Тарасенка. — Вендаражская школа далучылася да праекта і сабрала шмат карысных рэчаў для немаўлят. У канцы кастрычніка плануецца сустрэча з заснавальнікам фонду Аляксеем Талаем і перадача дапамогі на Данбас.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.
Магілёўскі р-н.

АЦЯПЛЕННЕ, АСФАЛЬТ, АГАРОДЖА

Газіфікацыя і дарогі — пытанні нумар адзін, якія стаяць на парадку дня Войскага сельвыканкама Камянеччыны

Спецыфіка населеных пунктаў Войскага сельсавета абумоўлена яго мінулым. Калісьці на тэрыторыі функцыянавалі тры сельгаспрадпрыемствы, потым іх аб'ядналі ў адно. Такім чынам два населеныя пункты — Мілакаева і Свішчова — перасталі быць цэнтральнымі сядзібамі гаспадарак з усімі наступствамі. Мае значэнне і тое, што тут у перыяд развіцця гаспадарак будавалі шматкватэрныя дамы, якія ацяпляліся цэнтралізавана. З рэарганізацыяй гаспадарак, перападпарадкаваннем аб'ектаў многія камунальныя праблемы сталі галаўным болем мясцовай улады.

Старшыня сельскага Савета Віктар МІХАЙЛОЎСКІ і энтузіяст добраўпарадкавання Пётр МАРОЗ.

Фінансаванне — з абласнога бюджэту

— Самым складаным пытаннем шэраг гадоў з'яўляецца ацяпленне пэўнай колькасці шматкватэрных дамоў, — расказвае **старшыня Войскага сельскага Савета Віктар МІХАЙЛОЎСКІ.** — Раней, у савецкі час, цяпло ў дамы паступала з цэнтралізаваных кацельняў, якія працавалі на вадкім паліве. Калі іх работа спынілася, у дзвюх цэнтральных вёсках правялі газіфікацыю. У іншых людзі вымушаны былі прыстасоўвацца хто як мог. Да гэтай пары можна сустрэць шматкватэрныя дамы з коміна-мі-дымаходамі на дахах. Не дзіва, што грамадзяне рэгулярна ўздымалі пытанне газіфікацыі на ўсіх узроўнях. З гэтага пачыналіся і гэтым заканчваліся сельскія сходы, пра гэта гаварылі на сустрэчах з дэпутатамі і прадстаўнікамі выканаўчай улады.

Некалькі гадоў таму нарэшце газіфікацыя астатняга праблемнага населенага пункта Свішчова была ўключана ў планы, прадугледжана фінансаванне з абласнога бюджэту. І працэс, як той казаў, пайшоў. Варта сказаць, што нітка газаправода, пра якую ідзе гаворка, даволі працяглая — сем з паловай кіламетра. Кошт першай часткі праекта складае 480 тысяч 258 рублёў. На сёння ўжо пракладзена 3,8 кіламетра газаправода. Да газу падключаны тры васьмікватэрныя жылыя дамы. Зроблены ўвод да дзевяці індывідуальных домоў уздоўж газаправода.

Пачаўся другі этап. Зроблены праект, сфарміраваны кааператыў на газіфікацыю 36 індывідуальных жылых дамоў, дзе фінансаванне будзе праведзена з разліку: 70 працэнтаў за кошт бюджэту і 30 працэнтаў за кошт насельніцтва. Кошт гэтага праекта складае 204 тысячы 196 рублёў.

Вядома, падвядзенне прыроднага газу ў кватэры і домаўладанні азначае зусім іншую якасць жыцця людзей. Вёскі, пра якія ідзе гаворка, немалыя. Акрамя карэнных жыхароў, тут нямала выхадцаў з Украіны, Казахстана, Расіі, якія прыехалі падчас будаўніцтва жывёлагадоўчага комплексу ў 80-я гады. Такі інтэрнацыянальны склад заўсёды быў адметнасцю тутэйшых вёсак. Жыве ўжо другое пакаленне перасяленцаў. А ўсяго ў склад сельсавета ўваходзіць 21 населены пункт.

І пешаходная, і аўтамабільная

